Полоцкая городская картинная галерея была открыта 20 февраля 1981 года как филиал Краеведческого музея. В 1985 году она вошла в состав Полоцкого историко-культурного заповедника.

---

* Л.М. Лысенко «Хроника Художественной галереи»., CD-ROM, фонды НПИКМЗ.

С 1981 по 1991 гг. Картинная галерея размещалась в отреставрированном здании бывшего Богоявленского собора, памятнике архитектуры XVIII века, который ранее являлся собором Богоявленского мужского монастыря, основанного в XVI веке. Внутреннее пространство собора (450 кв.м.) позволяло проводить областные, республиканские и всесоюзные выставки, посредством которых налаживались творческие связи с соседними республиками, государствами. Наряду с выставочной деятельностью велась работа по целенаправленному комплектованию фондов произведениями изобразительного искусства.

За 10 лет работы, с 1981 по 1991 гг., были проведены 82 выставки, ежегодно галерею посещали от 26000 до 18000 человек. Она являлась одним из центров культурной жизни города. При галерее работал «Клуб любителей искусств».

В 1992 году, в связи с передачей здания Богоявленского собора Полоцкой епархии, деятельность Картинной галереи продолжилась в здании Музея белорусского книгопечатания. На протяжении следующих 10 лет, с 1992 по 2002гг., были проведены 114 выставок, открыт художественный салон, велись реставрационные работы в здании будущей Художественной галереи.

С 7 сентября 2002 года Художественная галерея открыта в одном из корпусов бывшего иезуитского коллегиума, памятнике архитектуры XVIII века. На трёх этажах здания, общей площадью в 1704 кв.м., размещена постоянная экспозиция музея, которая знакомит с фрагментами стенописи полоцких храмов, иконописью XVII-XIX веков, культовыми прикладными предметами XI-XIX веков, светскими портретами XVIII века, произведениями изобразительного искусства Беларуси XX века, а также имеются экспозиционные залы для сменных выставок, помещение Художественного салона, который работает как «Клуб коллекционеров», фондохранилище.

# Кафляныя печы XVIII – пачатку XIX стст. Полацкага езуіцкага калегіума (па назіраннях на першым паверсе карпусоў «А» і «Г»)

*А.А. Салаўёў*

У сувязі з прыстасаваннем комплекса пабудоў былога езуіцкага калегіума пад вучэбныя карпусы ПДУ ў яго будынках былі распачаты буйныя рамонтныя работы, падчас якіх з боку Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ажыццяўляўся архітэктурна-археалагічны нагляд, фіксаваліся элементы інтэр'ераў памяшканняў, у прыватнасці падмуркі печаў на першым паверсе, збудаваных да пачатку перабудовы калегіума пад кадэцкі корпусу ў 1831 г. На другім і трэцім паверсе падмуркаў печаў пакуль не знойдзена. Сустрэты толькі кавалкі кафлі. Найбольш прыдатным для спробы рэканструкцыі печаў будуць знаходкі на першым паверсе. Інфармацыю аб складзе кафляных набораў печаў, аздабленні кафлін даў знойдзены на паддашшы завал кафлі, скінутай туды падчас будаўнічых работ у 1831 г. Было адрэстаўравана больш за 100 кафлін. Яны належалі да некалькіх кафляных набораў печаў. Супастаўленне знаходак з паверхаў і паддашша дазваляе зрабіць іх прывязку.

Па апісаннях складзеных А.К. Марэлем і В.П. Вікенцевым, вядома, што будынак да прыстасавання яго пад кадэцкі корпус меў «цёплую падлогу» і каміны, а печаў было мала. Але план першага паверха 1828 г. сведчыць, што печы знаходзіліся практычна ва ўсіх памяшканнях і былі часткова заглыблены ў нішы (**Мал. 1**). Некаторыя з іх былі праёмнымі. Па рашэнню камісіі, створанай для правядзення рамонтаў будынка на першым паверсе галоўнага корпуса планавалася разабраць старыя печы, на ўсіх паверхах замураваць пячныя праёмы і збіць выступы перад імі таўшчынёй ў тры цагліны [**2**, с. 21; **3**, с. 164; **7**, с. 33].

Падчас зняцця старой тынкоўкі з боку калідораў каля ўваходаў у келлі былі выяўлены закладкі лучковых арачных праёмаў шырынёй 0,7-0,9 м вышынёй каля 1,1 м. На іх адхо-

нах прасочана пабеленая калісьці паласа тынкоўкі са слядамі сажы, шырыня атынкаванай паласы каля 10-5 см (**Мал. 2**). З боку келляў таксама былі аркі. Яны не мелі тынкоўкі, на цаглінах моцны нагар. Гэта былі топачныя праёмы памерамі каля 0,6х0,45 м, многія з іх моцна пашкоджаны або знішчаны. Над гэтымі праёмамі прасочаны больш шырокія аркі 0,7-0,8 м шырынёй. Пустэча паміж аркамі запоўнена друзам, які выконваў ролю тэрмаізаляцыі паміж асноўнай сцяной і аркай топкі. Такім чынам, у выпадку рамонта апошняй, пячніку не прыходзілася ламаць сцяну. Паміж двума праёмамі ў тоўшчы сцен былі дымаходы. Вывучэнне дымаходаў каля памяшканняў № 6 і № 7, паказала, што надстаўкі першапачатковых печаў не былі звязаны з імі. Аналагічная канструкцыя выяўлена ў Пскове і ў горадзе Гарохаўцы, але ў апошнім яны не мелі пячных праёмаў, дымаходы зроблены ў скляпенні «пячуры» [**13**, с. 198]. Даследаванне муроўкі сцен калегіума каля пячных праёмаў паказала адсутнасць слядоў мацавання завес дзверак. Падобная канструкцыя вельмі нагадвае печы з перадтопачнай камерай, добра вядомыя па этнаграфічных матэрыялах Беларусі [**14**, с. 251]. Да таго ж, дзякуючы вялікай арцы праёма, было вельмі зручна чысціць коміны, знутры памяшкання і пазбегнуць выхаду на стромкі схіл даху. А.К. Марэль і В.П. Вікенцьеў, якія складалі апісанне будынка да 75-годдзя кадэцкага корпуса, гэтыя праёмы памылкова прынялі за каміны [**2**, с. 21; **12**, с. 10]. Пры расчыстцы праёма ў памяшканні № 6 быў знойдзены мулярскі малаток, які трапіў туды падчас рамонта будынка ў 1831 г. Каля топачнай аркі быў выяўлены ў сцяне крук ад верхняй пятлі топачнай дзверкі. Пячныя праёмы займалі ўсю таўшчыню сцяны і былі аб’ёмам каля кубаметра (у іх змяшчаўся дарослы чалавек). Іх вялікія памеры і знаходжанне каля саміх дзвярэй дазвалялі выкарыстоўваць гэтыя праёмы ў якасці камінаў пры ацяпленні калідора. Дно іх было з цэлай і бітай цэглы.

Падчас даследавання першага паверха былі знойдзены падмуркі 3 печаў. Першая печ выяўлена ў памяшканні № 11 корпуса «Г». Стужкавы падмурак захаваўся на чатыры рады цэглы. Яго знешнія памеры 2,1х0,9 м. Для будаўніцтва печы на скляпенні была зроблена вапнавая заліўка. Памеры цэглы

30-31х15-15,5х6,5-7 см. У канструкцыю паўднёвай, заходняй і паўночнай сценак былі ўключаны падлогавыя пліткі 22-23х28-29х6 см, пастаўленыя на рабро. Усходняя сценка была поўнасцю цагляная. Гэта выклікана стромкім схілам скляпення падвала. Прастора паміж пліткай і скляпеннем запаўнялася рош-чынай. Зверху яна перакрывалася радамі цэглы, шво паміж імі і пліткамі быў каля 3 см. Аб узвядзенні печы разам з будынкам сведчыць аднолькавая канструкцыя яе паўночнай і паўднёвай сценкі. Таўшчыня сценак падмурка розная, усходняя – 47 см (у паўтары цагліны), паўночная 40 см (2/3 і палова цагліны) заходняя – у 0,5 цагліны, для паўднёвай была выкарыстана ніша ў паўднёвай сцяне памяшкання. Падчас вывучэння гэтага падмурка і памяшкання прыкмет ацяпляльных хадоў не знойдзена (**Мал. 3**), насупраць падмурка печы быў вызначаны арачны пячны праём. Ён быў вусцем топкі печы. Побач з ім былі абломкі чорнапаліванай і тэракотавай кафлі з матывамі разеткі. Яны поўнасцю паўтаралі памерамі і аздабленнем знаходкі памяшкання № 11. З боку келлі топачны праём праступкваецца слаба. Запаўненне падмурка носіць двухслойны характар. Ніжні слой каля 0,3 м утрымлівае шмат вуголляў, перапаленай і часткова дэфармаванай цэглы сканцэнтраванай пераважна ў заходняй яго частцы. Разам з імі была знойдзена практычна цэлая гладкая карнізная кафліна з белай эмаллю 11х19х14,5 см і тэракотавая перамычка 3,5х18,5х6,0 см (**Мал. 5**). Верхні пласт каля 0,1 м – гэта кавалкі чырвонай абпаленай гліны з адбіткамі румп і дробныя абломкі кафлін XVIII ст. [**4**, с. 43] – чорнапаліваных з матывамі разетак, перамычак і карнізаў з белай эмаллю там жа знойдзена і манета «Денга» 1750 г.

Падмуркі яшчэ адной печы былі знойдзены ў памяшканні № 9 корпуса «А». Яны прадстаўлены цаглянай пляцоўкай у паўночна-заходнім вуглу келлі. Канструктыўныя асаблівасці скляпення падвала (значная стромкасць) не дазволілі зрабіць стужкавы падмурак і будаўнікі абмежаваліся заліўкай часткі скляпення рошчынай і муроўкай пляцоўкі 0,95х2,09 м з цэглы пальчаткі 6,0-6,5х14,0-15,0х3,0-31,0 см. з касымі баразнамі. Тарцом гэта пляцоўка прымыкала да пячной аркі, топачны праём быў перароблены ў дымаход. Пад ім прасочваюцца рэшткі

паўночнай сценкі (?) печы ў выглядзе выступа шырынёй 0,2 м вышынёй каля 0,1 м (**Мал. 4**). Кафляны матэрыял прадстаўлены толькі дробнымі кавалкамі медальённай сцяннай безрамачнай кафлі з зялёнай палівай (**Мал. 8**). На плане 1828 г. печ пазначана як праёмная. Далейшая расчыстка гэтага праёма дазволіла знайсці сляды першапачатковай выламанай перагародкі, паміж ёй і падмуркамі знойдзенай печы была выяўлена пашкоджаная адмостка з цэглападобных падлогавых плітак 6,0х27,0х18,5 см з касымі баразнамі. Захаваліся рэшткі муроўкі заходняй сценкі печы – счасаныя цагліны. Рэшткі печы і перагародкі знаходзіліся на адным узроўні з падлогай, што сведчыла аб іх адначасовым будаўніцтве ў 1750 г. Ад печы, пазначанай на плане 1828 г., бачны нагар на паўночным адхоне аркі, муроўка каля яе пяткі пашкоджана пры прабіванні новага дымахода. Падмурак аналагічнай канструкцыі прасочаны ў памяшканні № 7, але ён не даследаваўся з-за моцнай заліўкі падлогі. Былі вызначаны толькі яго памеры каля 1,0х2,1 м. Паўднёвая сценка разбурана. На той жа арцы таксама прасочаны нагар на цаглінах выламанай перагародкі).

Падчас замены цепласеткі гэтага ж «А» памяшканні № 2 былі знойдзены падмуркі кафлянай печы, папярэдне датаванай па кафлі канцом XVIII – пачаткам XIX стст. Была знойдзена тэракотавая і паліваная гладкая сцянная і карнізная кафля. Сярод іх тры зялёнапаліваныя плямістыя сцянныя кафліны памерамі 30,0х20,5х11,0-9,5 см. Венца іх румп шарападобнае сплюшчанае. Разам з імі знойдзены фрагмент плямістай кафліны шырынёй 21,0 см з румпай 6,8 см вышынёй. Там знойдзена цёмна зялёная кафліна памерамі 29,5х22,0х9,5 см. Кутняя сцянная кафля прадстаўлена фрагментам, шырыня меншай часткі і вышыня румпы аднолькавыя – 10 см. Малюнак плям і інтэнсіўнасць колеру нязначна адрозніваюцца ад вышэй апісаных сцянных вырабаў. Карнізная кафля прадстаўлена кутнім цёмна-зялёным вырабам, большая частка якога 28,0х17,0х14,5 см, меншая – 15,5х14,5х5,5 см (венца румпы абламана) і кавалкам тэракотавага вышынёй 19,5 см. Румпа апошняга сабрана з пласцін. Даўжыня гэтага тыпу кафлі адноўлена па паліванаму аналагу (часткі кутняй кафлі з паддашша ) – каля 36 см. Была знойдзена

і тэракотавая сцянная кафля з рэштками пабелкі, памеры пласцін паўтаралі паліваныя плямістыя вырабы з высокай румпай. Гладкая сцянная кафля з зялёнай, сіняй, карычневай, белымі і іншымі колерамі паліў выраблялася ў канцы XVIII – пачатку XIX стст. і дапаўнялася прафіляванымі карнізамі і каронкамі з геаметрычным арнаментам [**4**, с. 44; **6**, с. 72] (**Мал 9**).

На плане 1828 г. печ у паўднёва-ўсходнім вуглу памяшкання № 2 адсутнічае, печы ва ўсіх келлях зафіксаваны каля пячных праёмаў, іх памеры і форма аднолькавая, аналагічна печы з памяшкання № 9. Таму можна меркаваць, што знойдзеная печ збудавана ў 1831 г. са старой кафлі. Згодна з гістарычнай даведкай аб калегіуме практычна ўсе збудаваныя пры рамонце 1831 г. печы былі атынкаванымі незалежна ад канструкцыі, кафляныя пазначаюцца асобна, іх было вельмі мала. Напрыклад, на трэцім паверсе галоўнага корпуса іх было толькі дзве [**7**, с. 26, 28].

Кавалкі зялёнапаліванай кафлі знойдзены і ў памяшканні № 1 гэтага жа корпуса. Стужкавы падмурак печы, збудаванай пры рамонце калегіума ў 1831 г. быў запоўнены матэрыяламі канца XVIII – пачатку XIX стст. Кафля прадстаўлена дробнымі кавалкамі сцянных гладкіх зялёнапліваных пласцін і тэракотавага карніза.

У езуіцкай кухні знаходзілася тры печы, пазней на іх месцы была збудавана дрывяная пліта [**7**, с. 7]. Даследаванні былых памяшканняў кухні дазволілі выявіць завал з кафлі канца XVIII – пачатку XX стст. Ён знаходзіўся ў памяшканні № 10. Разам са сціннымі і карнізнымі кафлінамі з жоўтай гліны, зробленымі ў Віцебску (надпіс на кляйме), было знойдзена і шмат масіўных чырвонагліняных вырабаў з белай і зялёнай эмаллю. Гэтыя кафліны адрозніваліся тэхналогіяй вытворчасці: налеп невысокай румпы з трохкутным венцам, сфармаванай на ганчарным коле, больш грубае цеста чарапка і брудны колер эмалі. Асаблівай ўвагі заслугоўвае кафля з выгнутай паўкругам пласцінай. Магчыма, яна магла ўжывацца для пабудовы паўкалонак. Аднак баз і капітэляў не знойдзена (**Мал. 11**) Магчыма, мы маем справу з няпоўным наборам кафлі ад печы пачатку XIX ст., якая была збудвана да 1831 г. Невялікая

вышыня іх румп можа сведчыць пра тое, што печ, да якой яна належала была поўнасцю цаглянай. Наяўнасць сярод кафлі пачатку XIX ст. вырабаў машыннай вытворчасці сведчыла аб іх другасным выкарыстанні. Кафляныя печы ў памяшканнях калегіума (кадэцкага корпуса) зноў шырока выкарыстоўвалі ў канцы XIX ст., калі ўзнікла машынная вытворчасць кафлі з жоўтай гліны, цэнтрам якой стаў Віцебск, дзе ў 1790 г. быў створаны першы ў Віцебскай і Полацкай губернях кафляны завод.

Пры рэканструкцыі пячных набораў калегіума трэба звярнуць увагу на аналагічныя камплекты кафлі з Мірскага замка і Віцебска, у іх аздабленні прысутнічаюць элементы барока – вітыя балясіны і ўласцівыя класіцызму гладкія паверхні і прафіляваныя карнізы без арнаменту, або медальёны і прафіляваныя карнізы [**8**, с. 31; **16**, с. 233]. Кафля часам мела шмат зацёкаў і кропель палівы на кромках. Нярэдка яны былі няроўныя ці не быў вытрыманы прамы вугал. Такое карабленне здаралася пры нераўнамернай сушцы і ўсадцы сырога вырабу, але пры будаўніцтве печы кафлю звычайна не падчэсвалі да патрэбнага памеру. Нязначную розніцу паміж радамі кафлін кампенсавалі за кошт шырыні шчылін паміж пласцінамі, якая магла дасягаць 10 мм. Гэта добра бачна на графічным малюнку кафлянай печы XVII ст. [**17**, с. 148: Рис. 99]. На ім дакладна вызначана месца кожнай кафліны ў печы. Мастак (пячнік) пры сумяшчэнні радоў кафлі розных памераў і відаў дакладна пазначыў, дзе павінны знаходзіцца шчыліны паміж пласцінамі і іх колькасць. Шчыліны паміж кафлямі добра бачны і на печы, сфатаграфаванай ў 40-х гг. XX ст. ў адным з кляштараў Слоніма. [**17**, с. 149, Рис: 100, 101]. Для вялікіх закладак майстры выраблялі кафліны з надрэзамі на вонкавай пласціне, зробленыя ніццю па сырому вырабу. Пры расколе на пласціне атрымліваўся роўнае шво. Такую кафлю са швом звычайна ставілі каля сцяны памяшкання. З улікам таго, што кафляныя наборы знойдзеных печаў няпоўныя, асабліваe значэнне маюць іх даследаваныя натурныя рэшткі – падмуркі, аркі, дымаходы [**13**, с. 210], іх малюнкі на плане 1828 г.

З камплекту печы памяшкання № 11 корпуса «Г» цалкам захаваліся толькі карніз, перамычка і палова сцяннной кафліны. Узнаўленне выгляду і памераў астатніх элементаў набора дазволіў зрабіць аналагічны, знойдзены на II паверсе гэтага ж корпуса (**Мал. 6, 7**). Там жа была кутняя сцянная паліхромная кафля, якая мела палову пласціны з чорнай эмаллю і паўкруглае паглыбленне з белай эмаллю, кафлі верхняга і ніжняга радоў мелі арнаментаваныя «conchк» [**19**, с. 96]. Пераходы паміж ярусамі і завяршэнне базы і надстаўкі печы рабіліся з дапамогай гладкіх і медальённых карнізаў, перамычак з белай эмаллю. Рэшткі падобнай сцяннной кафлі знойдзены і за межамі печы. Яны мелі невысокія румпы (каля 8,5 см) з шырокім трохкутным венцам, аналагічныя гладкім карнізам. Карнізы з медальёнамі ў картушы былі з акруглым венцам румпы, пры чым паліваная кафля канцэнтравалася каля паўночнай сцяны, а тэракотавыя – каля ўсходняй. Пры вызначэнні вышыні ніжняга яруса печы неабходна ўлічыць памеры топачнага праёма. Разам са скляпеннем вышыня яруса была не менш 1,0 м. Неабходна адзначыць і значную шырыню падмуркаў яе сцен, што магло быць звязана з уладкаваннем уступа пад пліткі падлогі або, што больш верагодна, з існаваннем у печы цокаля вышынёй каля 0,5 м. Дзякуючы яму, звонку яна выглядала як трох’яруснае збудаванне, неабходная таўшчыня сценак у ніжняй частцы дасягалася выкарыстаннем падлогавых плітак, якія таўшчынёй былі блізкімі да цэглы. Пры аднаўленні канструкцыі і памераў печы неабходна прыгадаць знаходку з Міра [**1**, с. 231: Мал. 128 III]. Звяртае ўвагу незвычайная вышыня нішы, ў якой была ўладкавана гэта печ. З улікам памераў нішы можна вызначыць вышыню печы – каля 3 м. У профіль печ з калегума блізкая да L – падобнай формы, чым нагадвала печы XVI-XVII стст. з Заслаўя [**5**, с. 56: Рыс. 30], але яе надстаўка была прамавугольнай, а не квадратнай. У той жа час распаўсюджвалася і новая канструкцыя печаў – камерная. Топка падобнай печы часта выходзіла ў сумежнае памяшканне і была звязана з камерай(скрыняй) дымаходамі. Пры паленні такой печы дым трапляў ў камеру праз ніжні дымаход і выходзіў праз верхні ў комін [**8**, с. 45]. Печ з калегіума паўтарала канструкцыю «dwusryniowych» печаў, апісаных М.

Дамброўскай [**19**, с. 62]. Ніжні ярус гэтай печы складаўся з цэглы і плітак на вышыню каля 1 м. Ён выкарыстоўваўся як топка. Ролю сеняў выконваў калідор будынка. З гэтым, магчыма, звязана і муроўка сценак ніжняга яруса таўшчынёй у адну цагліну і з падлогавых плітак (каб захаваць яе вогнетрываласць павялічыць цеплааддачу). Яе скляпенне было з адтулінамі, праз якія дым выходзіў у жаравыя калодзежы надстаўкі. Падобная канструкцыя печаў вядома і па матэрыялах Пскова, дзе яны таксама мелі пячныя каваныя засаўкі [**15**, с. 75]. На Беларусі засаўка ўжывалася з XVI ст. [**18**, с. 115]. Асаблівасць печаў з калегума – адсутнасць гарызантальных дымаходаў з засаўкамі. Памеры надстаўкі печы з калегіума не перавышалі 1,0х1,4 м, таму з улікам даўжыні цаглін можна меркаваць, што печ мела 3-4 прамавугольныя цагляныя калодзежы. Надстаўка падобнай канструкцыі выконвала ролю каўпака, дзе збіралася гарачае паветра і пасля ахаладжэння выходзіла пад скляпеннем топачнага праёма [**10**, с. 23-24]. Падобная канструкцыя зафіксавана на малюнку печы XVII ст. [**18**, с. 115]. Для памяншэння цяжару ў скляпенне надстаўкі маглі быць умазаны тэракотавыя кафліны. Улічваючы невялікую вышыню румпаў кафлін, можна лічыць, што печ была цалкам выкладзена з цэглы. Ніжні ярус меў сценкі ў адну цагліну. Усходняя і паўночная сценкі часткова былі з плітак. Верхні ярус – з цэглы пастаўленай на кромку. Падобная канструкцыя сценак топкі дазваляла зэканоміць цэглу і зрабіць под на яе выступах, пры гэтым захаваць трываласць пятак яе скляпення і хуткі нагрэў (**Мал. 3**). Галоўны фасад печы быў арыентаваны на поўнач і складаўся з кафлі з чорнай і белай эмаллю. Ніжнія карнізы былі з гладкіх вырабаў, сярэдні і верхні аздаблялі медальёны ў рамках. Паміж імі і сцяннымі кафлямі ставіліся перамычкі. Кутнія складаліся з чорнай паловы разеткі і белага ўвагнутага вугла. Усходняя і заходняя сценка былі часткова тэракотавымі і пабеленымі. Увогуле ж для аздаблення двух сценак гэтай печы патрабавалася каля 370 кафлін усіх відаў і памераў. Аналагічныя печы згадваюцца ў апісанні сядзібнага дома XVIII ст. у маёнтку Горсплі на Полаччыне: «былі гэта нібы вялізныя шафы, выкладзеныя кафлямі, з адным скляпеннем і комінам. Сцены ў іх былі тоўстыя цагляныя…таму

да гэтых мураваных прадпеччаў насілі бесперапынна альховыя, бярозавыя або сасновыя калоды і не пасекшы іх, клалі прама на вуголлі…вось чаму сценкі такіх печак, грубамі званых, смярдзелі гарэлым» [**11**, с. 308]. Прыгаданая архітэктоніка печы была распаўсюджваецца у Беларусі з канца XVI ст., калі пераход паміж ярусамі ажыццяўляўся з дапамогай гзымсаў [**1**, с. 347]. Такім чынам, на падставе прыведзеных фактаў і меркаванняў магчыма зрабіць спробу графічнай рэканструкцыі печы (**Мал. 13, 14**).

Збудаванне вялікай печы ў памяшканні № 9 не выпадковым. Яно з'яўлялася прахадным і да ўзвядзення у 1780 г. двухпавярховага будынка (корпус В) выходзіла на вуліцу, таму трэба было стварыць «цёплы бар'ер», каб захаваць цяпло ў калідоры і келлях. Гэта печ пазначана на плане 1828 г. (**Мал. 1**)

Наступная печ гэтага часу знойдзена ў памяшканні № 9 корпуса «А». Па тэракотавых аналагах поўнага профілю з завалу на паддашшы можна аднавіць зялёнапаліваную сцянную кафлю з медальёнам з падмурка (**Мал. 8**). Мяркуючы па памерах нішы, вышыня печы была каля 2,5 м. Зрабіць аднаўленне ўсяго кафлянага набору печы вельмі складана з-за адсутнасці на падмурку фрагментаў іншых відаў кафлі. Для аднаўлення магчымага складу кафлянага набору печы былі вылучаны агульныя крытэрыі для ўсіх кафлін: колер і адценне палівы, профіль румпы, стылістычныя асаблівасці арнаменту (безрамач-ныя, матывы медальёна, выразны буйнарэльефны нескладаны геаметрычны арнамент, уласцівы для позняга барока і ранняга класіцызму). Са з находак на паддашшы да яго магчыма аднесці невялікія прафіляваныя карнізы, фрызы з нескладаным геамерычным арнаментам, купалкі і каронкі (**Мал. 8**). Спалучэнне прафіляваных карнізаў і медальёнаў вядо-ма па віцебскіх кафляных наборах [**9**, с. 31]. Купалкі мелі прафіляванае завяршэнне, чым нагадвалі карнізы. Падобныя вырабы канца XVI ст. вядомы ў Заслаўі і аздаблялі рагі печы [**5**, с. 31; **1**, с. 342]. Зыходзячы з суадносін памераў і размяшчэння падмуркаў і топачнага праёма і мяркуючы па значнай вышыні румпаў сцянных кафлін топка печы магла мець сценкі з цэглы пастаўленай па рабро, а яе скляпенне і надстўка быць з гліны. Карнізная кафля мела вельмі кароткую румпу, таму пры

ўладкаванні ў печ яна не выступала над сцяной. Розніца паміж радамі кампенсавалася за кошт шырыні вертыкальных швоў паміж кафлінамі, што былі шырынёй да 10 мм. Над карнізам надстаўкі знаходзіліся фрызы (паяскі). Падобнае іх уладкаванне вядома ў печах Польшчы [**19**, с. 68] і прасочваецца на заслаўскіх печах, рэканструкцыя якіх зроблена Ю.А. Зайцам [**5**, с. 53]. Над імі па вуглах печы ўзвышаліся купалкі і каронкі. На аснове прыведзеных меркаванняў можна прапанаваць магчымы варыянт графічнай рэканструкцыі знешняга выгляду печы (**Мал. 15, 16**). Па форме і канструкцыі яна аналагічная печы з памяшкання № 11 корпуса «Г», але, мяркуючы па падмурку, у нішу яна не была заглыблена, цагляным быў толькі яе ніжні ярус, скляпенні і надстаўка былі гліняныя. Прастора паміж печчу і перагародкай выкладзена пліткай.

На падставе наяўнага матэрыялу з'явілася магчымасць прапанаваць і частковую рэканструкцыю печы памяшкання № 2 гэтага ж корпуса, якая па плану 1828 г. знаходзілася ў паўночна-заходнім вуглу памяшкання. З улікам таго, што памеры і форма падмуркаў печаў на плане 1828 г. была аднолькавай, можна казаць, што ў плане каля падмурка яна была не больш 1,0х2,1 м. Пры разборцы завала на паддашшы былі знойдзены тэракотавыя і зялёнапліваныя плямістыя сцянныя, карнізныя і кутнія кафліны. Адзін тэракотавы карніз быў расколаты па спецыяльнаму надрэзу пласціны, зробленаму да абпалу (**Мал. 10, 17, 18**). Дзякуючы кутнім вырабам стала магчымым аднавіць завяршэнне вуглоў выяўленай печы. Гэтыя кафліны былі трохчасткавыя, гладкія, верхнія і ніжнія мелі прафіляваныя «conchę», памеры іх 30,0х21х10,5 см, шырыня меншай часткі была да 10,5 см. Печ пачыналася на адзін рад муроўкі вышэй выступа пад падлогу ў заходняй сцяне келлі (улічана таўшчыня падлогі). Гэта было двух'яруснае збудаванне, канструкцыя якога цалкам паўтарала печ з памяшкання № 9. У самым нізе знаходзіліся карнізныя кафлі, румпы якіх былі сабраны з пласцін. Гэта дазваляла пры напаўненні іх глінай стварыць трывалы падмурак пад наступныя рады кафлі. Профіль гэтых карнізаў дазваляў лёгка адчышчаць іх ад бруду. Фрагмент падоб-

най плямістай пласціны знойдзены на паддашшы, профіль яго крыху адрозніваўся ад знаходкі з падмурка 1831 г. Карнізы, што аздаблялі пераход паміж верхнім і ніжнім ярусамі печы, мелі больш складаны профіль. Памеры і профіль плямістага карніза з паддашша быў адноўлены па сабранаму цалкам кутняму зялёнапаліванаму вырабу з падмурка 1831 г. Сценкі печы былі з плямістай кафлі. Гэта дазваляла зрабіць памяшканне больш светлым, стварыўшы ўражанне пашыранай прасторы. Частка кафлін печы не мела запаўнення глінай і была са слядамі нагару на румпе. На яе аблямоўку было патрэбна каля 130 кафлін усіх прыгаданых відаў. Да гэтай печы належалі і плямістыя каронкі, якія аздаблялі верх акруглага франтона галоўнага (заходняга) фасада печы. Адсутнасць кафлі ад франтона дазваляе аднавіць магчымую форму верха печы толькі часткова, зыходзячы з формы абрэза ніжняй кромкі каронак (**Мал. 17**).

Да памяшкання № 1 гэтага корпуса магчыма прывязаць толькі сцянныя кафлі з цёмна-зялёнай палівай, якія палівай падобны на знаходкі з падмурка. Сярод іх адна кафліна вылучалася вышынёй румпы і памерамі пласціны.

Выяўленыя падмуркі і кафлі прадстаўляюць асобую цікавасць, бо дазваляюць аднавіць знешні выгляд печаў. Аздабленне кафлі дазволіла лічыць часам іх пабудовы перыяд паміж 1750-1828 гг. Першапачатковыя кафляныя печы мелі познебарокавае аздабленне – арнаментаваныя перамычкі, медальёны, разеткі на сцянных кафлях. Канец XVIII ст. – час з’яўлення і распаўсюджвання гладкай кафлі зялёных, белых і карычневых колераў і аздаблення яе белымі бессістэмнымі плямамі, што характэрна для класіцызму, якому ўласцівы вялікія роўныя паверхні сценак печы, падзеленыя прафіляванымі неарнаментаванымі карнізамі. Рэльефным геаметрычным арнаментам аздабляліся толькі каронкі [**6**, с. 72-73].

Такім чынам, на падставе матэрыялаў даследавання першага паверха карпусоў «А» і «Г» можна зрабіць наступныя вынікі:

- пры ўзвядзенні будынка ў 1750 пячное ацяпленне планавалася адразу, для чаго практычна ў кожнай келлі быў змураваны пячны праём з боку калідора;

- першапачатковыя печы аздабляліся медальённай кафляй і кафляй з разеткамі;

- у параўнанні з XVII ст. канструкцыя печаў значных змен не зведала. У келлях першага паверха даследаванай часткі будынка знаходзіліся выцягнутыя прамавугольныя ў плане печы, іх вышыня вызначалася памерамі ніш, у якіх яны ставіліся;

- па канструкцыі яны нагадвалі этнагарафічныя кухонныя «белыя» печы з прадпеччамі XIX-XX стст.;

- напрыканцы XVIII – пачатку XIX стст. частка печаў аздаблялася гладкай кафляй. У сувязі з частковай перапланіроўкай па злучэнні келляў некаторыя печы будаваліся ў арках як праёмныя і былі зафіксаваны на плане 1828 г.;

**-** падчас рамонту 1831 г. усе печы былі знішчаны, частка кафлі была выкарыстана для будаўніцтва новых печаў.

**Літаратура**

1. **Археалогія Беларусі**: У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV-XVIII стст. / В.М. Ляўко, М.Ф. Гурын, Ю.А. Заяц і інш.; Пад рэд. В.М. Ляўко і інш. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 597 с.: іл.

2. **Викеньтьевъ С.П.** Полоцкій кадетскій корпусь (історіческій очеркь 75-летія его существованія). – Полоцк, 1910. – 396 с.: 43 табл.

**ПИАЗ КП 5- 2457 2458**

3. **Габрусь Т.В.** Мураваныя харалы: Сакрал. Архітэктура бел. барока. – Мн.: Ураджай., 2001, – 287 с.: іл.

4. **Дук Д.** Цеплыня ад цеплыні. // Мастацтва. – 2001. – № 5. С. 42-46.

5. **Заяц Ю.А.** Заслаўская кафля / Пад рэд. Г. В. Штыхава. - Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.: іл.

6. **Здановіч Н.І., Трусаў А. А.** Беларуская паліваная кераміка XI-XVIII стст. / Пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 183 с.: іл.

7. **Кукуня О., Соболь В.** Объект: Памятник архитектуры XVIII в. (Корп. «А» изуитского коллегиума в г. Полоцке) Эскизный проэкт, комплексные научные изыскания. Историко-архивные и библиографические исследования. Том 2. Кн 5. – Мн., 1994.

8. **Левко О.Н.** Гончарство северо-восточной Белоруссии XIV-XVIII вв. – Мн.: Наука и техника, 1975. – 64 с.

9. **Левко О.Н.** Витебские изразцы XIV-XVIII вв.– Мн.: Наука и техника, 1981. – 46 с.: ил.

10. **Литавар В.В., Койданов Г.Л.** Как построить печь, камин, баню. – М., 1999.

11. **Мальдзіс А.** Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. – Мн.: Лімарыус, 2001. – 384 с.

12. **Морель А.К.** История города Полоцка и возникновение здания Полоцкого кадетского корпуса. – Вильно, 1907.

13. **Немцова Н.И.** Реконструкция изразцовых печей в доме Сапожникова в г. Гороховце. // Советская археология. – 1985. – № 4. – С. 198-212.

14. **Русаў Пётр.** Абліцоўка вусцяў менскіх печаў XVI-XVII стст. // Гістарычна-археалагічны зобрнік. № 19. – Мн., 2004. – С. 251-257.

15. **Спегальский Ю.П.** О некоторых приёмах устройства отопительных печей XVII в. (по находкам в Пскове) // КСИА. Вып. 113. – 1968. – С. 74-77.

16. **Трусов О.А ., Чернявская И.М., Кравцевич А.К.** Архитектурно-археологи-ческое исследование Мирского замка и городского посёлка Мир Гродненской области. // Советская археология. – 1986. – № 4. – С. 216-235.

17. **Трусов О.А.** Памятники монументального зодчества Белоруссии XI-XVII вв.: Архитект.-археологический анализ. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 160 с.: ил.

18. **Трусаў А.А.** Старонкі мураванай кнігі. Манум. архітэктура эпохі феадалізма і капіталізма.- Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 191 с.: іл.

19. **Dąbrowska M.** Kafłe ł piece kaflowe w Polsce do konca XVIII w. // Studia i materiały z historii kultury materialnej. – 1987. – T. LVIII. – s. 270




**Мал. 1.** Фрагмент плана першага паверха калегіума 1828 г.




**Мал. 2.** Пячныя праёмы памяшканняў №6 і 9, топачныя праёмы памяшканняў № 6, 7 з боку калідора.




**Мал. 3.** Падмурак і рэканструкцыя папярэчнага разрэза печы памяшкання № 11 корпуса «Г».




**Мал. 4.** Падмурак і рэканструкцыя папярочнага разрэза печы памяшкання № 9 корпуса «А».




**Мал. 5.** Кафля з падмурка печы памяшкання № 11 корпуса «Г».



**Мал. 6.** Кафля з памяшкання № 1 корпуса «Г».




**Мал. 7.** Кафля ад аналагічнага набора з другога паверха.




**Мал. 8.** Кафля з паддашша ад печы памяшкання № 9 корпуса «А» і рэканструкцыя сцяннай кафлі па знаходкам з падмурка.




**Мал. 9.** Кафля другаснага ўжытку з падмурка печы памяшкання № 2 корпуса «А».




**Мал. 10.** Кафля з паддашша ад печы памяшкання № 2 корпуса «А».




**Мал. 11.** Кафля з памяшканняў № 10-11 корпуса «А»
(былая езуіцкая кухня).




**Мал. 12.** Мулярскі малаток з пячной аркі памяшкання № 6 корпуса «А».



**Мал. 13.** Рэканструкцыя ўсходняга фасада печы з памяшкання № 11 корпуса «Г».



**Мал. 14.** Рэканструкцыя паўночнага фасада печы з памяшкання № 11 корпуса «Г».



**Мал. 15.** Частковая рэканструкцыямагчымага выгляду ўсходняга фасада печы з памяшкання № 9 корпуса «А».



**Мал. 16.** Частковая рэканструкцыя магчымага выгляду паўднёвага фасада печы з памяшкання № 9 корпуса «А».




**Мал. 17.** Частковая рэканструкцыя магчымага выгляду ўсходняга фасада печы з памяшкання № 2 корпуса «А».




**Мал. 18.** Частковая рэканструкцыя магчымага выгляду паўднёвага фасада печы з памяшкання № 2 корпуса «А».

# Особенности адаптации учеников вспомогательной школы в музейном пространстве

***Т.Р. Смирнова***

Конечной целью специального образования детей с физическими и психическими отклонениями является полное интегрирование в общество.

Интеграция – одно из важных средств подготовки к самостоятельной жизни в обществе. Этот вопрос, безусловно, касается и детей общеобразовательных школ.

Но поскольку экспериментальную работу мы проводили с детьми, имеющими отклонения в психофизическом развитии, то вопрос адаптации в условиях музейного пространства мы изучали именно с этими детьми.

Человек не только приспосабливается к окружающему миру, но и воздействует на него. Психика формируется и проявляется в деятельности, то есть выступает в качестве её регулятора.

Используя разные модели (музейные уроки, занятия-игры, тренинги, познавательно-практические игры) мы трансформировали пространство Детского музея. Что входит в понятие «трансформировать»? Трансформация – это использование музейного пространства, музейного предмета в разных целях. То есть музей – это:

- пространство, наполненное предметами;
- место, где можно получить информацию;
- пространство, где можно использовать свои знания и применить их;
- место для общения.

На данном этапе работы Детский музей стал как бы образовательным учреждением, в котором дети демонстрировали свои умения и навыки, полученные на уроках в школе и на музейно-педагогических занятиях в прошлом учебном году.

Из прошлых выступлений вы помните, что мы определили психокоррекционный характер музейно-педагогических занятий, особенно их влияние на развитие эмоциональной сферы.

Известно, что в недрах предметной деятельности формируются предпосылки других видов деятельности: игровой, учебной, трудовой. А в процессе любого вида деятельности человек всегда опирается на свой прошлый опыт, на ранее усвоенные знания, умения и навыки.

Итак, мы выдвинули гипотезу, что представленное разнообразное количество предметов в музее обеспечивает социализирующее влияние окружающей среды и активизирует социальное поведение детей (на разных уровнях – продуктивном, игровом, трудовом).

Поэтому мы поставили перед собой следующие задачи:

- содействовать углублению эмоционального отклика детей;
- учить хронологической определённости во времени;
- через индивидуальные речевые задания пробуждать желание самим общаться с материалом (книгой, научным текстом, музейным предметом);
- научить достраивать речевую ситуацию;
- совершенствовать механизмы познания мира (то есть слуховое восприятие, поведенческие реакции, тактильные ощущения, эмоции).

Таким образом на данном этапе экспериментальной работы мы обучали через предмет и использовали роль предмета в обучении.

Мы предлагаем вашему вниманию фрагменты музейного урока, где наглядно демонстрируется, как решались вышеизложенные задачи.

Комбинированный урок «окружающий мир» и «математика» проводит учитель-дефектолог Королёва С.В. с учащимися 1 и 3 класса (смешанный класс). Практически большая часть детей имеет отягощённый диагноз. С учащимися закрепляются знания о временных представлениях, совершенствуются навыки ориентировки в пространстве, тренируется счётный навык.

Просмотр видеоматериала.

Для проведения урока были использованы тематические комплексы «Часы»; «Весы»; «Колокола». Конструкция витрины, ограниченное число предметов, небольшое пространство – все эти факторы дают возможность наиболее доступно сформировать те или иные понятия как у детей дошкольного возраста, младшего школьного возраста, так и у детей с психофизическими особенностями. А учитывая, что у наших детей затруднено формирование хронологической последовательности событий, можно активно работать по разным направлениям:

- проводить интегрированные уроки;
- отрабатывать речевые задания;
- тренинги;
- организовывать разные виды игр.

Необходимо отметить, что дети с интеллектуальной недостаточностью приближают прошлое: участников далёких исторических событий они считают героями недавнего прошлого или даже настоящего, у детей данного типа затруднено формирование таких понятий, как прошлое, настоящее, будущее, то есть формирование хронологической последовательности событий.

Ведь временные представления и понятия имеют особенности, затрудняющие их восприятие и усвоение, а именно:

- Невозможность восприятия времени органами чувств: время в отличие от других величин (длины, массы, площади) нельзя видеть, осязать, мускульно ощупать.

- Меньшая конкретность временных представлений по сравнению с другими, например, пространственными представлениями.

- Большая обобщённость, малая дифференцировка.

- Возможность измерения времени только косвенным путём, то есть через те измерения, которые производятся за определённый временной интервал: количеством движений (перемещением стрелок по циферблату часов).

- Обилие и разнообразие временной терминологии (потом, раньше, теперь, быстро, медленно) и относительность её употребления.

Если вернуться к уроку, то благодаря такой форме проведения дети наглядно увидели, что навыки счёта, знание цифр, использует человек во всём своём жизненном пространстве, в том числе и в музее. С помощью цифр можно определить количество колокольчиков, узнать, который сейчас час, сколько времени прошло с начала занятия, сказать, сколько весит тот или иной предмет. А свободно общаясь с музейными экспонатами, дети косвенно начинают понимать историческую значимость предмета. Научный сотрудник музея (в данном случае – гном) даёт дозированную научную информацию о предметах, так как любой музейный урок для любой аудитории должен содержать такой этап работы. А как известно из исследования, выполненного отечественными психологами (Белявский Б.В., Уфимцева Л.П. и других) и учёными, в процессе коррекционного обучения у умственно отсталых учеников совершенствуются не только элементарные виды мышления (наглядно-действенное, наглядно-образное), но и более сложные виды мышления (словесно-логическое).

Обогащение знаний детей с интеллектуальной недостаточностью об окружающем мире происходит не только и не столько за счёт упражнений органов чувств, сколько за счёт развития у них навыков практической деятельности, умений использовать сведения, полученные с помощью органов чувств (на данном уроке – это прослушивание звуков колокольчиков, взвешивание разных предметов).

Включение детей в самостоятельную, практическую и умственную виды деятельности, является одним из способов развития и совершенствования личности. Поэтому на уроке использованы задания:

- Помоги гномику собрать часы.

- Покажи, какие предметы, на каких весах нужно взвесить.

Многократное общение с музейным пространством способствует формированию ориентировки в окружающем

мире у всех детей и элементарных умений социального взаимодействия.

В итоге, этот урок подтвердил нашу гипотезу об активизации социального поведения детей в пространстве музея: снялись неуверенность, страх, реактивные состояния. А по ответам детей, выполненным практическим заданиям, по форме общения и силе выраженности эмоций мы делаем вывод, что мы смогли создать (организовать) естественное взаимодействие ребёнка с социальным окружением.

**Литература**

**Вагапова Д.Х.** Риторика в интеллектуальных играх и тренингах. – М.: Цитадель, 1999.

**Выготский Л.С.** Собр.соч. Т 4: Детская психология./ Под редакцией Д.Б. Эльконина. – М.: Педагогика, 1984.

**Долгобородова Н.П.** Обучение во вспомогательной школе. – М.: Просвещение, 1976.

**Ерёменко И.Г.** Олигофренопедагогика. – К.: Высшая школа, 1985.

**Рубинштейн С.Я.** Психология умственно отсталого школьника. М.: Просвещение, 1986.

**Тылизина Н.Ф.** Формирование познавательной деятельности младших школьников. – М.: Просвещение, 1992.

# Дэйніс Пятро Язэпавіч – выдатны полацкі краязнаўца

*Н.А. Сяргеенка*

Сапраўднае краязнаўства – гэта значная навуковая і грамадская дзейнасць, у якой заўсёды вылучаюцца лідэры, якія ведаюць як працаваць, якія фарміруюць вакол сябе дзейны, працавіты асяродак. Прыкладам дзейнага полацкага краязнаўцы, аўтарытэтнага падчас станаўлення краязнаўства, але ж малавядомага сёння, з'яўляецца асоба Пятра Язэпавіча Дэйніса (1873-1941) [**2**, а. 1-5] (У рускім варыянце імя – Пётр Иосифович, сам Дэйніс у беларускім варыянце называў сябе – Пятром Язэпавічам, у сучасным варыянце – Пётр Восіпавіч).

Зацікаўленасць гісторыяй Полацкай зямлі прыйшла да яго адразу пасля прыезду сямьі, Дэйнісаў з Невеля ў Полацк у 1905 годзе. Пятро Язепавіч працаваў пры раскопках у Полацкам павеце, пры рэстаўратарах у Сафійскім саборы, вывучаў старажытнасці Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, Барыса-глебскага комплексу. Валодаў польскай, літоўскай, нямецкай, «старалітоўскай» і лацінскай мовамі, якія вывучаў самастойна. Ужо ў 38-гадовым узросце паступіў у маскоўскі Археалагічны інстытут, які выдатна скончыў у 1915 г. з прысваеннем звання вучонага археолага і залічэннем у сапраўдныя члены інстытута. Быў адзначыны залатым медалём. Такім чынам ён атрымаў трэцюю адукацыю. (1891 – Паневежская настаўніцкая семінарыя, 1895-1898 гг. – Віленскі наст. Інстытут, дзе вывучаў фізіку, скончыў з залатым медалём ). Напісаў дысертацыю на тэму – «Полоцкие церковные древности в их историческом прошлом и настоящем». У новую эпоху «савецкага будаўніцтва» Пятро Язэпавіч уступае на пасадзе інспектара Вышэйшага гарадскога вучылішча, якое месцілася у будынку № 4 па Верхне-Пакроўскай вуліцы. Там жа былі пакоі сям'і інспектара і яго памочніка.

Дакументальныя крыніцы Полацкага і Віцебскага архіваў, фондаў НПГКМЗ дазволілі высветліць невядомыя факты актыўнай грамадскай і навуковай дзейнасці гэтага цікавага чалавека.

У 1919 годзе Пятра Дэйніса напаткала бяда – памерла жонка. На руках засталася 14-гадовая дачка Серафіма. Сын Іван пераводзіцца з Віцебска ў Полацк на педагагічныя курсы, пачынае працаваць у Полацку. Лёс бацькі і сына звязваецца асноўнай настаўніцкай працай у былым Вышэйшым вучылішчы, якое падчас савецкага часу рэарганізуецца ў Першую Савецкую школу, і дзе бацька паспяхова працуе дырэктарам (1918-1926 гг). Па сумяшчальніцтву бацька і сын Дэйнісы працуюць і на іншых працах: 1920-22 гг. – у Камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, з 1922-1923 года – у педагагічным тэхнікуме. Нягледзячы на эканамічныя і сямейныя цяжкасці, адміністратыўныя перамены ўлады, Пятро Язэпавіч застаецца ў цэнтры навуковай і грамадскай працы горада.

У Полацкім архіве захоўваецца вялікі артыкул Пятра Язэпавіча «Витебские известия» ад верасня 1920 года. [**10**, а. 14-55] Артыкул прысвечаны 20-гадоваму самаадданаму хлопцу Курту Берчы (1900-1920), сыну полацкага лютаранскага пастара, выхаванцу Рыжскай нямецкай гімназіі, потым Смаленскай гімназіі. З-за вайны і хваробы бацькі Берчы вярнуўся ў 1917 годзе пасля 6-га класа ў Полацк. Менавіта гэты хлопец, піша Дэйніс П.Я., у савецкі час арганізаваў гурток аматараў даўніны мясцовага краю і менавіта яму, па словах П.Я. Дэйніса, належала ідэя неабходнасці стварэння ў Полацку гісторыка-археалагічнага і прыродна-этнаграфічнага народнага музея. У сваім артыкуле словы «пад кіраўніцтвам мясцовага вучонага – археолага» П. Дэйніс сціпла закрэслівае, але відавочна, што актыўная дзейнасць зацікаўленых аматараў даўніны вялася дзякуючы кіраўніцтву і ведам Пятра Язэпавіча, вакол яго асобы групуецца сапраўднае краязнаўчае кола таго часу і вядзецца праца па стварэнні музея ў Полацку. Архіўныя звесткі таксама гэта пацвярджаюць. Ёсць дакументы [**13**, а. 44, 46, 57, 65, 67, 74, 75], аб працы па зборы для музея каштоўных старажытных прадметаў у прыватных асоб у 1919 годзе ў Полацку, спіс 15 актыўных сяброў музейнай працы пад кіраўніцтвам А. Еленева (у большасці-выкладчыкі школ, сярод іх – П.Я. Дэйніс), аб'явы К.Ф. Берчы аб абмеркаваннях арганізацыйных пытанняў музея, пры гэтым сябры запрашаюцца на паседжанні па адрасу Леніна 14, у будынкі Лютаранскай Кірхі. Памяшканне для музея пла-

нуецца ў доме № 14 па вул. К. Маркса, нават робіцца шыльда «Краявы музей» і распрацоўваецца смета на арганізацыю музея, у якую ўключаюцца расходы на ўтрыманне загадчыка музея і вартаўніка. Але пытанне адкрыцця музея ў 1919 годзе адкладваецца ў сувязі са складанасцямі ваеннага часу – 20 верасня польскія войскі захапілі левабярэжную частку Полацка.

Пасля вызвалення горада ў Полацку ствараецца Камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, якую ўзначальвае П.Я. Дэйніс. Камісія абазначае вялікае кола пытанняў сваёй дзейнасці, да працы далучаюцца найбольш адукаваныя і здольныя людзі. 20-ці гадовы Курт Берчы прызначаецца на пасаду сябра, альбо намесніка старшыні камісіі. Хлопец працуе з адданасццю, без асабістай выгады. Заўсёды сціплы, акуратны, удумлівы і клапатлівы ў працы, ён імкнецца зафіксаваць усё, што было каштоўнай спадчынай народа, каб на сведках мінуўшага і перажытага ствараць справядлівую гісторыю лёсу мясцовага краю, сведчыць Пятро Язэпавіч. За 3 месяцы працы ў камісіі Курт Берчы зрабіў шмат: даследваў манументальныя помнікі горада, правёў рэгістрацыю іх, склаў вопісы, зрабіў малюнкі, фотаздымкі. Праца адзначана Віцебскай губернскай Камісіяй, але 31 жніўня 1920 года хлопец раптоўна памёр ад халеры. Аддзел народнай асветы арганізуе пахаванне 1-га верасня. Газета «Витебские известия» адмаўляе Пятру Дэйнісу ў магчымасці надрукаваць некралог памяці Курта Берчы, сына лютаранскага пастара – «няма месца». [**10**, а. 13]

Захаваліся ў Полацкім архіве таксама і лісты самога Курта Берчы [**12**, а. 1-4], магчыма артыкул , які таксама наўрад ці быў апублікаваны – «Древний Бернардинский монастырь в Полоцке». Гаворка ў артыкуле ідзе больш пра гістарычны лёс беларускага народа., які як гарох пры дарозе, хто ідзе, той яго і скубе. Асноўную бяду сучаснага беларуса хлопец бачыць у непісьменнасці і неадукаванасці, а непісьменны не можа быць свабодным чалавекам. Берчы прыводзіць прыклады з гісторыі Полацка, аналізуе магчымасць прымянення багатай полацкай спадчыны для карысці сучаснасці. Ён піша пра касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі Бернардзінскага манастыра, які быў цэлым у той час: «Чувствовалось … что новая свежая жизнь,

как – то может ужиться со стариною, которая со временем сама разрушается. Ведь уже знаменитый немецкий поэт Шиллер говорил: «старое разрушается, меняются времена и жизнь новая растёт из-под развалин» Но всё-таки следует отметить одну черту, отличительную для нашего времени: уже человек у нас не создаёт таких основательных построек, вместо огромных каменных зданий везде сооружаются какие-то жалкие бараки, вместо каменной ограды протянута проволока, и даже на месте отмирающих лип растёт только лоза да ива…».

Як не зразумець сёння гэтыя песімістычныя папярэджанні, гледзячы на катастрафічны фізічны стан некалі белых муроў бернардзінскага касцёла, які быў цэлым і захаваным... Трагічны лёс напаткаў і старажытныя царкоўныя каштоўнасці, якія выяўлялі і бралі пад ахову сябры камісіі.

Уліковая праца Полацкай Камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва завершылася рабаваннем цэркваў атрадамі ГПУ падчас правядзення аперацыі «Баявік» на Полаччыне. [**7**, с. 58-63; **8**, с. 187-191] У сакавіку 1922 г. камісія спыніла дзейнасць «па прычыне скарачэння штатаў» – улады рыхтавалі юрыдычную свабоду правядзенню рабавання цэркваў. Даведка камісіі [**9**, а. 219], у якой на пачатку 1922 года фактычна працаваў толькі Пятро Язэпавіч Дэйніс, папярэджвае ўлады аб прадметах мастацкай і музейнай значнасці сярод канфіскаваных царкоўных каштоўнасцей, якія былі вывезены з Полацка ў Гохран. Але папярэджанні навукоўца не захавалі рарытэтныя каштоўнасці для будучага полацкага музея.

Аналіз дакументаў дазваляе высветліць актыўную дзейнасць П.Я. Дэйніса і ў далейшы час.

У 1923 годзе загадчыкам павятовага аддзела народнай адукацыі прызначаецца Васіль Іванавіч Шыманоўскі, былы вучань Полацкай настаўніцкай семінарыі. Адразу пры аддзеле ствараецца навукова-метадычны савет [**17**, а. 186], у які ўваходзяць Хрылёў Іван Ісакавіч – інспектар аддзела, Аргіроўскі Філосаф Паўлавіч – загадчык педтэхнікума, загадчыкі школ – Цясто Барыс Фёдаравіч, Дэйніс Пятро Язэпавіч, Львоў Вячаслаў Аляксандравіч, Пігулеўскі Аляксандр Фаставіч, старшыня савета Рабпроса т. Антонава, нацмен Губельбанк. Таксама 15 верасня 1923 года ствараецца Метадычная

Камісія [**11**, а. 172] – Дэйніс П.Я., Пігулеўскі А.Ф., Цясто Б.Ф., Львоў В.А., Аргіроўскі Ф.П., Хрылёў І.І. Камісія падзяляецца на 3 секцыі: славесная, грамадска-гістарычная, матэматычная. Навукова-метадычны савет знаёміць праз павятовыя гурткі, курсы і канферэнцыі з новымі накірункамі ў педагогіцы. Задача арганізаванай працы – падрыхтаваць настаўнікаў горада і павета ва ўмовах перамен, якія адбываліся ў школе ў той час. Адным з выдатных накірункаў таго часу ў развіцці народнай асветы было тое, што краязнаўства бярэцца за аснову выкладання і навучання ў школах. Пачынаецца распрацоўка гэтай працы на месцах. Метадычны савет і павятовы аддзел народнай адукацыі распрацоўвае і дасылае ў школы павета цыркуляр [**14**, а. 14-15] «Аб краязнаўстве» ад імя гародскога аддзела Народнай асветы за подпісамі Шыманоўскага і Хрылёва. Прапануюцца метадычныя парады па арганізацыі краязнаўчай працы, па стварэнні школьных музеяў, камплектаванні іх, стварэнні краязнаўчых камісій. Уводзяцца новыя накірункі ў педагагічнай працы, такія як комплексная сістэма выкладання. У авангардзе іх – Полацкі педагагічны тэхнікум. Пятро Язэпавіч пачынае выкладаць там фізіку і методыку прыродазнаўства, вядзе практычныя ўрокі, стварае і вядзе працу у кабінеце педтэхнікума. [**3**, а. 9]

15 сакавіка [**14**, а. 8] (па іншых дадзеных – 20 сакавіка [**11**, а. 350]) 1924 года пры аддзеле народнай адукацыі зноў арганізуецца Камісія па ахове старажытнасці, мэтай якой ставіцца вывучэнне гісторыі мясцовасці па археалагічных дадзеных. Старшынёй камісіі прызначаецца Шыманоўскі В.І, сябрамі – Дэйніс П.Я., Вышалескі Ф.Г. (1890 г.н. з духоўнікаў), Лаўроўскі А.І. (курс Петрагр. археалагічнага інстытута), Аргіроўскі Ф.П. і Хрылёў І.І. Вырашана было пачаць працу з 1 красавіка, збірацца 2 разы на месяц. Але 25 сакавіка адбываецца рэарганізацыя аддзела народнай адукацыі, загадчыкам прызначаецца Южык Яўген Адамавіч (1896 г.н., член КП(б)), полацкі аддзел пераходзіць у веданне Мінскага народнага камісарыята асветы. У былой Віцебскай губерні РСФСР пачынаецца палітыка беларусізацыі. І Камісія па вывучэнні гісторыі мясцовасці працягвае працу ўжо ў Полацкай Акрузе БССР у новым складзе. З былых супрацоўнікаў у новую краязнаўчую ўстанову горада – Краязнаўчае Таварыства – уваходзяць толькі

Барыс Фёдаравіч Цясто і Пятро Язэпавіч Дэйніс, які прызначаецца на пасаду намесніка Краязнаўчага Таварыства [**18**, а. 16-17; **19**, а. 21], уваходзячы ў праўленне. 26 снежня 1924 года распрацоўваецца статут таварыства. Старшынёй часова прызначаецца – Лубоўскі Янка Пракопавіч (1891 г.н. б/п, інспектар), намеснікам – П.Я. Дэйніс, сакратаром – Пятро Сідаравіч Крывіцкі (1903 г.н., выкладчык бел. мовы), казначэем прызначаецца Барыс Фёдаравіч Цясто. Намечаны 20 чалавек – Трубач Янка, Гарбуз(коў), Южык Я.А. і інш. настаўнікі, якія прыбываюць у горад пасля заканчэння БДУ, Мінскага педагагічнага тэхнікума. На пасадзе сакратара Краязнаўчага Таварыства будзе ў 1925 годзе працаваць Іван Дэйніс. Склад праўлення таварыства будзе мяняцца і пашырацца, але Пятро Язэпавіч Дэйніс будзе заўсёды заставацца ў праўленні на розных пасадах. Выконваць абавязкі старшыні ў праўленні будуць – Южык Я.А., Цясто Б.Ф., потым Сянкевіч Валяр’ян Антонавіч, які прыдзе на пасаду загадчыка акруговага аддзела народнай асветы, потым гісторык, выпускнік БДУ Сяргей Міронавіч Мялешка. Менавіта Краязнаўчае Таварыства будзе ў авангардзе палітыкі беларусізацыі ў акрузе, вынікамі працы гэтага таварыства – уздым краязнаўства на адметны ўзровень і стварэнне Акруговага Краязнаўчага музея . Полацкі архіў мае шмат дакументаў аб вялікай працы таварыства. Калі будзе падрыхтавана стацыянарная выстава другога паверха Краязнаўчага музея, магчыма будзе пазнаёміцца з цікавымі звесткамі гісторыі краязнаўства ў Полацку. На маю думку, неабходна і магчыма падрыхтаваць асобную брашуру па гэтай тэме сумеснымі сіламі навукоўцаў, якія займаліся дадзенай праблемай.

Сіламі Краязнаўчага Таварыства рыхтуюцца артыкулы ў мясцовую газету «Полацкі Араты», «Савецкую Беларусь», часопіс «Наш край» – аб пачатку працы ў Краязнаўчым напрамку, аб праблемах таго часу. На жаль, публікацыі не даследаваны – неабходна праца ў прэзідэнтскай і нацыянальных бібліятэках.

У фондах НПГКМЗ мы маем зборнік «Полотчина» [**6**], які быў падрыхтаваны аддзелам народнай асветы Полацка і сябрамі Краязнаўчага Таварыства – аб гэтым ёсць сведчанне полацкага архіва. [**18**, а. 43] Аналіз артыкулаў зборніка дае магчымасць зразумець навуковыя ўяўленні Пятра Язэпавіча

– менавіта яму мог належаць  раздзел зборніка «Памятники старины и былого величия города Полоцка» [**6**, а. 11-15]. У зборніку пералічваюцца помнікі мастацтва і старажытнасці на тэрыторыі г.Полацка і яго ваколіцаў, якія яшчэ заставаліся ў Полацку і былі ўзяты пад ахову ў чэрвені – ліпені1925 года спецыяльнай гарадской камісіяй. [**16**, а. 5-6] Як вучоны-археолаг П.Я. Дэйніс таксама працуе ў гэтай камісіі разам са Сташэўскім – старшынёй Полацкага Акруговага Выканаўчага камітэта, членам Інбелкульта М. Шчакаціхіным, прадстаўніком Народнай Асветы Южыкам і загадчыкам камхозу Грушэўскім.

Калі параўнаць спіс помнікаў, які змешчаны ў зборніку «Полотчина», са спісам, прынятым пад ахову камісіяй, то добра бачна невыпадковая ўпартасць, з якой аўтар зборніка абараняе свае веды адносна даціроўкі Сафійскага сабора (па – XI ст.), даецца аўтарскае тлумачэнне часткі тэкста крыжа, які ўпершыню пачынае апісвацца  вучонымі савецкага часу і прадстаўнікамі ўлады менавіта з 1925 года. У спіс старажытных помнікаў былой велічы Полаччыны аўтар зборніка дадаткова ўключае помнік у гонар вайны 1812 года і валун «Барыса-Глеба». Як у зборніку, так і ў спісе помнікаў падкрэсліваецца неабходнасць аховы дзяржаўных помнікаў. Спіс камісіі ўключае:

«…- Замкавую гару пры вытоцы Палаты ў Дзвіну

- Сафійскі сабор 1751 г. з часткай 12 ст.

- Цытадэльны вал 16 ст.

- Мікалаеўскі Сабор паловы 18 ст.

- Спаскую царкву 12 ст.у б. Спаскім кляшторы

- Руіны Барысаглебскай царквы 12 ст. у б. Барыс. кл. з фрэскавым роспісам на мурах.

- Царкву у м. Струня Полацкай Акругі з аградаю 18 ст.

- Так званы крыж Эўфрасінні 12 ст. у б. Спаскім кляштары…»

Апошні запіс у дакуменце зроблены рукой Дэйніса П.Я. Відавочна, крыж Еўфрасінні Полацкай трапляе ў камісію адразу пасля закрыцця манастыра і перадачы будынка Спаса-Праабражэнскай царквы пад клуб раённага выканаўчага камітэта ў чэрвені 1925 года [**15**, а. 168], адразу пачынае вывучацца навукоўцамі, магчыма, у гэты ж час арганізуецца зварот да спецыялістаў крамлёўскіх музеяў. У віцебскім архіве ёсць

копія «Заключение хранителя оружейной палаты на крест Евфросинии Полоцкой» [**4**, а. 26], якое, на жаль, мае прыкладную даціроўку – 28.12.1924-03.09.1929 гг.

Адначасова, Дэйнісу П.Я – кіраўніку гісторыка-археалагічнай секцыі Краязнаўчага Таварыства, спецыялісту па полацкіх царкоўных помніках – даручаецца зрабіць план рэстаўрацыі Барысаглебскай і Пятніцкай цэркваў. [**16**, а. 11-12] Разбураныя цэрквы павінны былі быць адрамантаваны і прыведзены ў адпаведны выдатнаму значэнню гэтых помнікаў выгляд. М. Шчакаціхін пагадзіўся з праектам Дэйніса – гэты каштоўны дакумент таксама ёсць ў архіве Полацка. Шчакаціхін падкрэслівае імкненне Дэйніса захаваць каштоўны фрэскавы роспіс. Будынкі старажытных манастыроў разбіраліся на цэглу, звароты Б. Цясто і П. Дэйніса ў Акрвыканкам не даюць вынікаў, запыты Інбелкульта і Шчакаціхіна таксама.

Акрамя актыўнай выдавецкай і лекцыйнай працы, сябры Краязнаўчага Таварыства прымаюць удзел у падрыхтоўцы святкавання 400-годдзя беларускага друку, якое намячаецца на снежань 1925 года. [**20**, а. 1, 3, 4, 12, 28, 32, 43] Гэта свята было сапраўдным сцягам палітыкі беларусізацыі на Беларусі і асабліва ў Полацку. Асноўныя мерапрыемствы скарынаўскага свята ў горадзе павінны былі адбывацца на сафійскай гары. Там ствараўся сквер імя Скарыны, каля Сафійскага сабору планавалася пабудаваць помнік Скарыне, і «усё гэта цалкам з Сафійскім Саборам будзе з’яўляцца помнікам пачатку беларускай культуры ў Полацку» – з пастановы Краязнаўчага Таварыства.

Дэйніс Пятро Язэпавіч уваходзіць у камісію Акруговага аддзела народнай адукацыі па правядзенні свята, такім чынам рыхтуе і адказвае за шэраг святочных мерапрыемсваў у школах горада. Адначасова ён дэлегуецца і ад Краязнаўчага Таварыства ў Агульнагарадскую камісію па правядзенні скарынаўскага свята ў Полацку, якая складаецца з 6-ці чалавекі

«… - Подзін/Акружком КПБ
- Сянкевіч/Аддзел Нар Асветы
- Дэйніс/Краязнаўчае Таварыства
- Мялешка/саюз працаўнікоў Асьветы
- Дадон,Новікаў сябры КТ…»

Намечаны святочныя мерапрыемствы, сярод якіх цікавя наступныя:

«…- назваць імям Скарыны Полацкую друкарню,

- прасіць Акрвыканкам аб адчыненні Краязнаўчага музею імя Скарыны…»

Падчас правядзення свята Дэйнісу П.Я. даручаецца скласці каштарыс і план правядзення закладкі помніка Ф. Скарыне, але ўстаноўка помніка будзе перанесена на вясну.

Скарынаўскія святы спыняліся 30 снежня 1925 г. Гэты дзень у рэспубліцы быў абвешчаны юбілейным святочным днём. У гарадскім тэатры адбыўся ўрачысты сход сябраў гарсавета, партыйных, прафесійных і вайсковах арганізацый, на якім выступілі дакладчыкі – Мікалай Шчакаціхін і Сяргей Мялешка з працамі аб 400-х годдзі беларускага друку і аб жыцці і дзейнасці беларускага выдатнага вучонага і культурніка Ф. Скарыны. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел мастацкія сілы горада, адбылося сапраўднае свята беларускай культуры, уздым якой быў абумоўлены вялікай краязнаўчай працай , якая сапраўды была наладжана ў той час у горадзе і падтрымлівалася адукаванай часткай інтэлігенцыі горада. Падчас свята на сходзе сяброў гісторыка-археалагічнай секцыі Краязнаўчага Таварыства і на ўрачыстым сходзе гарадскога і раённага настаўніцтва і сяброў Краязнаўчага Таварыства Пятро Язэпавіч Дэйніс робіць даклады «Гістарычнае развіццё і праца Полацкай арганізацыі па вывучэнню мясцовага края» [**19**, а. 32] і «Краязнаўчая праца ў горадзе». На вялікі жаль, не знойдзены ані тэксты гэтых дакладаў, ані чарнавыя накіды… Ці вёл лі гаворку гэты чалавек аб разбурэнні і рабаванні полацкіх царкоўных старажытных помнікаў, аб адсутнасці музея ў горадзе, аб неаднаразовых спробах зрабіць музей і аб тых людзях, якія распачыналі гэту працу…Ці ўзгадваў ён Курта Берчы, сына лютаранскага пастара, і ці выпадкова, што менавіта ў Лютаранскай Кірсе знайшоў пастаянны прытулак Полацкі краязнаўчы музей, пасля рэпрэсій над першымі музейшчыкамі і рэарганізацыі экспазіцыі Акруговага краязнаўчага музея на Сафійскай гары часоў беларусізацыі ?...

Так ці інакш, Краязнаўчае Таварыства ўжо 24 снежня 1925 года даручае С. Мялешку, гісторыку, выкладчыку і Бабковічу

– старшыні саюза Працасветы, мастаку – паклапаціцца аб адкрыцці музея [**20**, а. 47]… Ужо праз чатыры гады пасля дэйнісаўскага праекта рэстаўрацыі будынкаў Барысаглебскіх цэркваў 27-мі гадовы старшыня Краязнаўчага таварыства, Сяргей Міронавіч Мялешка, зноў будзе ўздымаць як у мясцовым так і рэспубліканскім друку праблему разбурэння старажытных цэркваў. Зноў будзе «знойдзены» крыж Лазара Богшы, які быў узяты пад ахову Інбелкультам дзякуючы камісіі,у якой працаваў Пятро Язэпавіч, яшчэ ў 1925 годзе. Адчынецца ў Сафійскім саборы на Скарынаўскай горцы Акруговы Краязнаўчы музей, які, на вялікі жаль, вельмі нядоўгі час будзе сапраўдным цэнтрам беларускай культуры ў горадзе…Экспазіцыя музея, экспанаты рэлігійнай тэматыкі, такія, як карціна «Забойства Стэфана», будуць перададзены ў Гомель [**5**, а. 55] і іншыя гарады яшчэ ў 30-я гады. Старажытныя цэрквы Струні, Бельчыц будуць канчаткова зруйнаваны. Шмат дзеячоў таго часу пацерпяць менавіта як абаронцы царкоўнага мастацтва яшчэ падчас беларусізацыі, на доўгі час будуць забыты і імёны славутых полацкіх краязнаўцаў, музейшчыкаў.

Да восені 1926 года Пятро Язэпавіч актыўна працуе ў Полацку. Першая Савецкая школа, якую ён узначальвае, мае лепшы будынак у горадзе, усе настаўнікі адпавядаюць свайму прызначэнню і паспяхова вядуць працу беларусізацыі, адзначана ў спаваздачах [**21**, а. 7, 117]. У школе – вялікая бібліятэка, архіў , узорны кабінет фізікі, у які прыходзяць вучні з іншых школ горада. Але ж менавіта ў 1926 навучальным годзе адбываецца перагляд складу загадчыкаў беларускіх і расейскіх школ гораду. У 1925-26 гг. у Полацку адбываецца рэарганізацыя школ і «праводзіцца перакідванне настаўніцкага персаналу і папаўнення яго апралетарызіраваным элементам – красным настаўніцтвам». Прызначаецца 40 новых настаўнікаў замест 100 ранейшых па школах. 14 верасня 1926 года, пасля 3-х спрэчных паседжанняў па пытанні аб загадчыку 1 школы П.Я. Дэйнісе тагачасны загадчык Акрана Сянкевіч В. А. (правам рашаючага голаса – пры галасаванні галасы падзяліліся – 3 за і 3 супраць) уносіць прапанову зняць Дэйніса П.Я. з працы ў гарадскіх школах сямігодках і перавесці яго на пасаду загадчыка Асвейскай сямігодкі «у сувязі з тым, што з боку настаўніка

Дэйніса шматразова заўважваліся моманты адхілення ад кіраўніцтва Акраддзелу Нарасьветы». [**22**, а. 210, 212] Незадаволены такой пастановай, Пятро Язэпавіч звяртаецца ў Народны Камісарыят Асветы, і ужо ў 1926 годзе ён пераязджае ў Гомель, дзе працуе, па сведчанні сына, у пачатковых школах, а з 32 года, калі адчыняецца ў Гомелі медычны тэхнікум выкладае там фізіку. Загінуў Пятро Язэпавіч падчас эвакуацыі ў 1941 годзе. Пахаваны ў Казані.

Сын Іван пакінуў нам пра бацьку зусім мала звестак, у фондах музея ёсць 2 калектыўныя фотаздымкі з выявай Пятра Язэпавіча і адна копія з фотаздымка [**1**, с. 15-16]. Атэстат аб заканчэнні Маскоўскага археалагічнага інстытута Іван Дэйніс перадаў у дом-музей Васняцова, таму што магчыма гэты мастак распрацаваў дызайн дакумента. На маю думку, у сувязі са значнасцю асобы Пятра Язепавіча для краязнаўства Полаччыны неабходна:

- адшукаць матэрыялы архіва Дэйнісаў у доме-музеі Васняцова,
- зрабіць спробу адшукаць матэрыялы дысертацыі Пятра Язэпавіча ў дзяржаўных архіўных фондах Расіі,
- падрыхтаваць запыт у фонды Гомеля, каб высветліць далейшы жыццёвы шлях Дэйніса П.Я.,
- у архівах Беларусі і РФ адшукаць іншыя полацкія друкаваныя выданні таго часу, сведкі навукова-грамадскай працы полацкіх краязнаўцаў,
- пасля чаго, сабраныя матэрыялы прадставіць у экспазіцыі Краязнаўчага музея.

Відавочна, што ў розныя гістарычныя эпохі менавіта вакол Дэйніса П.Я., адукаванага і цікавага чалавека, групавалася кола полацкай інтэлігенцыі, якая вяла педагагічную працу ў горадзе, займалася стварэннем гарадскога музея, разгортвала краязнаўчую працу ў Полацкай акрузе, займалася вывучэннем і аховай Полацкіх помнікаў даўніны. Без уяўлення гістарычнай значнасці асобы Пятра Язэпавіча няпоўнымі будуць нашы веды адносна многіх пытанняў Полацкай гісторыіі першай чверці XX стагоддзя.

**Літаратура**

**1.** Альбом сямейны з фотаздымкамі Дэйніса І.П. **ПКМ КП2-1422/10.**

**2.** Аўтабіяграфія Дэйніса І.П. 12.11.1969. **ПИАЗ КП4-1010/1.**

**3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці**. Ф. 246, воп. 1, спр. 147, св. 10.

**4.** Там жа. Ф. 1947, воп. 1, спр. 14. св. 1.

**5.** Там жа. Ф. 1947, воп. 1, спр. 98. св. 8.

**6. Полотчина.** Издание Полоцкого Окружного Исполнительного комитета. – Полоцк, 1925 г. **ПГКЗ КП14-11518.**

**7. Сяргеенка Н.А.** Аперацыя «Баевік»: мерапрыемствы савецкай улады па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі мошчаў святых на Полаччыне на пачатку 1920-гг. // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі НПГКМЗ па выніках навукова-даследчай работы ў 2003 г. – Полацк, 2004.

**8. Сяргеенка Н.А.** Аперацыя «Баевік»: мерапрыемствы савецкай улады па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і ліквідацыі мошчаў святых на Полаччыне на пачатку 1920-гг. // Проблемы славяноведения. Сборник научных статей и материалов. Вып.6. – Брянск: Издательство БГУ, 2004.

**9. Установа «Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку»**. Ф. 51, воп. 1, спр. 108, т. 2.

**10.** Там жа. Ф. 54, воп. 1, спр. 34.

**11.** Там жа. Ф. 54, воп. 1, спр. 60.

**12.** Там жа. Ф. 54, воп. 1, спр. 191.

**13.** Там жа. Ф. 54, воп. 1, спр. 232.

**14.** Там жа. Ф. 54, воп. 1, спр. 365.

**15.** Там жа. Ф. 104, воп. 1, спр. 62а, т. 1.

**16.** Там жа. Ф. 104, воп.1, спр. 81.

**17.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 7, т. 2.

**18.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 37.

**19.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 70.
**20.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 77.
**21.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 86.
**22.** Там жа. Ф. 112, воп. 1, спр. 92.
**23.** Там жа. Ф. 2212, воп. 1, спр. 22.

# Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ

# Газеты 1941-1945 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі, у фондах НПГКМЗ

*І.П. Воднева*

**Уступны артыкул**

22 чэрвеня 1944 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна. Важную ролю ў мабілізацыі савецкага народа на барацьбу з гітлераўскай Германіяй адыграў друк, які быў рэарганізаваны ў адпаведнасці з запатрабаваннямі часу. Газеты падпарадкоўвалі ўсю сваю дзейнасць паказу вызвыленчай, справядлівай вайны, велічных подзвігаў савецкага народа, выхаванню мужнасці і адданасці сваёй Радзіме. Першыя нумары беларускіх газет амаль цалкам запаўняліся зводкамі Саўінфармбюро і мясцовай інфармацыяй. Выехаўшы з Мінска, друкаваліся ў Гомелі газеты «Звязда», «Советская Белоруссия» і мясцовая газета «Гомельская праўда», агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». Умовы працы былі вельмі складанымі. Але нягледзячы на недахоп журналісцкіх і паліграфічных кадраў, у прыфрантавым Гомелі за 48 сутак было выдадзена 144 нумары газеты, 48 нумароў агітплаката і 36 лістовак, агульным тыражом больш за 3 мільёны экзэмпляраў. З 19.08.41 г. выданне рэспубліканскіх газет часова спынена. Замест іх на неакупаванай тэрыторыі СССР на беларускай мове з лістапада 1941 г. пачала выходзіць «Савецкая Беларусь», першы нумар якой быў надрукаваны паблізу Арла. З лютага 1942 г. «Савецкая Беларусь» і агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну» пачалі выдаваць у Маскве, а потым перавозілі на акупіраваную Беларусь. Але друкаваных матэрыялаў, якія друкаваліся для Беларусі, усё роўна не хапала. Газеты і лістоўкі не заўсёды своечасова даходзілі да месца прызначэння, аператыўна і ў поўным аб'ёме адлюстроўвалі падзеі. Гэта стала асноўнай прычынай для стварэння партызанскага і падпольнага друку ў тыле ворага.

Першымі падпольнымі выданнямі былі лістоўкі і звароты да насельніцтва, машынапісныя газеты і бюлетэні. Першым нелегальным друкаваным подпольным выданнем стаў «Весник Родины», які выдаваўся Мінскім падпольным гаркомам КП(б)Б.

У маі і верасні 1942 г. ім жа было выдадзена 4 нумары газеты «Звязда». Выхад газеты стаў ударам разбуральнай сілы па ўсёй акупацыйнай палітыцы нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі.

На барацьбу супраць нямецкіх акупантаў актыўна падняліся партызаны і падпольшчыкі. Яны збіралі рэшткі былых друкарняў, шукалі матэрыялы, а галоўнае – спецыялістаў. З мэтай узмацнення прапаганды праз друк на акупаванай тэрыторыі ЦК КП(б)Б 15.12.1942 г. прыняў рашэнне стварыць у снежні 1942 г. – студзені 1943 г. 10 абласных і 50 раённых падпольных друкарняў. Былі падабраны на месцы або перапраўлены з савецкага тылу журналісты, наборшчыкі, друкары. Быў наладжаны выпуск партатыўнай друкарскай машыны канструкцыі механіка Ф.М. Пільціенка з фабрыкі «Палесдрук», якую зрабіў маскоўскі завод «Геапрыборколермет». Да чэрвеня 1943г. на захопленую тэрыторыю рэспублікі было перапраўлена 167 такіх машын. Было патрыхтавана 70 наборшчыкаў. Гэта ўсё дазволіла наладзіць у 1942-1943 гг. выпуск 134 газет, а ўсяго за перыяд акупацыі на Беларусі выйшла болей за 160 газет.

У 1943-1944 гг. падпольныя друкарні размяшчаліся ў асноўным у партызанскіх зонах. Так, наша Полацкая раённая газета «Большэвіцкі шлях» друкавалася на базе 3-й Беларускай брыгады, якая дзейнічала на тэрыторыі Полацкага раёна. У выпадку пагрозы захопу ворагамі тэрыторыі, якая кантралявалася партызанамі, падпольныя друкарні мянялі месцы базіравання, але не спынялі выпуску падпольных выданняў.

Вядома, што «жывой» газета можа стаць толькі на дзейсных фактах. Падпольныя газеты былі насычаны менавіта такімі фактамі, якія суправаджаліся фотаздымкамі і замалёўкамі. Клішэ для газет работнікі падпольных друкарняў рабілі самі. Звычайны кавалак сухой бярозы, дубу, кавалак лінолеуму або гумы ў руках спрактыкаванага мастака ператвараўся ў вострую карыкатуру на ворага. На старонках газет, акрамя паведамленняў рэдактараў, саміх партызан, можна было сустрэць і мастацкія творы знакамітых беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, К. Крапівы і інш. Многія з іх падчас вайны былі карэспандэнтамі беларускіх газет і часопісаў.

Каб зрабіць сваё выданне больш праўдзівым і дасканалым, некаторыя газеты накіроўвалі свае выязныя рэдакцыі ў партызанскія атрады, бліжэй да лініі фронту. Так, летам 1942 г. журналісты «Комсомольскай правды» працавалі спачатку на Смаленшчыне, а потым на Беларусі.

У партызанскіх фарміраваннях, акрамя друкаваных выданняў падпольных РК КП(б)Б, выпускаліся і рукапісныя часопісы, насценныя газеты, баявыя ліссткі саміх партызанскіх атрадаў і брыгад. Яны з'яўляліся адной з самых распаўсюджаных форм падпольнага друку ў тыле ворага.

У часы Вялікай Айчыннай вайны свае выданні былі і ў франтоў, армій, дывізій, брыгад. Газеты франтоў ствараліся галоўным чынам на базе газет ваенных акругоў. У першыя месяцы вайны яны выдаваліся на 4 палосах, але ўжо з кастрычніка 1941 г. з-за недахопу паперы іх фармат паменеў удвая. Тыраж газет вагаўся ад 15 да 100 тыс. экзэмпляраў, а колькасць – залежала ад колькасці франтоў.

Тыражом каля 8тыс. экзэмпляраў спачатку на 4, а пасля на 2 палосах выходзілі газеты армій . Некаторыя з іх друкаваліся на мовах народаў СССР. Усяго за ваенны час было выдадзена 124 армейскія газеты і газеты армейскага тыпу.

Асноўнымі раздзеламі ўсіх газет падчас вайны былі «Фронт», «Тыл», «Міжнароднае жыццё». На першай старонцы заўсёды публікаваліся зводкі Саўінфармбюро. Са старонак газет пастаянна гучалі заклікі: «Ні кроку назад!», «Стаяць насмерць!», «Усё для фронта!», «Усё для перамогі!», «Прачытаў і перадай другому!». Падчас карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне з'явіўся лозунг: «Толькі наперад!». Карэспандэнты газет знаходзіліся блізка да падзей, аб якіх пісалі, аператыўна асвятлялі абстаноўку, расказвалі пра герояў, якіх чытачы ведалі асабіста. Вялікую ролю ў ваенным друку адыгралі пісьменнікі. Іх накіроўвалі на фронт, у партызанскія атрады. Пасада пісьменніка была ўключана ў штат франтавой і армейскай газет. Часта на старонках газет друкаваліся лісты з фронту на фронт. Іх адметнымі рысамі былі прастата, шчырасць, кароткі змест. У іх было шмат пачуццяў, унутранай упэўненасці, маральнага духу. Прыкладам мужнасці сталі лісты нашай зямлячкі, Зінаіды Тусналобавай.

Такім чынам, друк падчас вайны, нягледзячы на скарачэнне палос, невялікія тыражы падпольных і партызанскіх газет, нерэгулярнасць выпуску, недахоп паперы, сыграў важную ролю ў мабілізацыі насельніцтва да ўсенароднай барацьбы з фашысцкімі акупантамі. Газеты і часопісы паказвалі Вялікую Айчынную вайну як справядлівую і вызваленчую, выкрывалі захопніцкі, грабежніцкі характар фашысцкага нашэсця. На старонках перыядычных выданняў расказвалася пра гераізм савецкіх воінаў на франтах, самаадданую працу рабочых, сялян, інтэлігенцыі ў савецкім тыле, пра міжнародныя навіны. У кожным нумары асвятлялася баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Друк клікаў да зрыву ўсіх мерапрыемстваў акупантаў, да стварэння нясцерпных умоў для гітлераўскіх захопнікаў і іх памагатых, умацоўваў веру ў перамогу.

У фондах НПГКМЗ дадзены перыяд прадстаўлены 160 адзінкамі, з якіх толькі 6 – навукова-дапаможнага фонда. Частка газет знаходзіцца ў экспазіцыі музеяў запаведніка: МБК-3, МТМ-8, МБС-4. Большасць газет , якія складаюць дадзены каталог, уваходзяць у калекцыю А.Л. Матусевіча (41 адз.). Значную частку, у асноўным нашых полацкіх газет, перадалі ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, настаўнік, краязнаўца, пісьменнік Маніс М.А. (16), ганаровы грамадзянін горада Полацка Сіманоўскі Н.Ф. (19), карэспандэнт газеты «Сцяг камунізму» Ясюкевіч Л.І. (11). Газеты гэтага перыяду павінны стаць важнай крыніцай па вывучэнні гісторыі Полаччыны і ўсёй краіны падчас Вялікай Айчыннай вайны.

**Каталог**

**1.** «**Большэвіцкі сцяг**», № 90 (100), пятніца, 3.08.1945. Год выдання другі. Орган Полацкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблсавета дэпутатаў працоўных. Намеснік адказнага рэдактара П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Зварот калгаснікаў с/г арцелі ордэна Леніна ім.Ільіча, Дабрынскага р-на, Варонежскай вобласці да ўсіх калгаснікаў СССР», с. 1.

«Вялікі арктычны пералёт», с. 1.

М.Маніс «Пра ўзровень гаспадарчага кіраўніка», с. 2.

Змест і агляд раённага друку, с. 3.

Міжнародныя навіны, с. 4.

**ПИКЗ КП14-11576**

«**Большэвіцкі сцяг**» – орган Полацкага абласнога і гарадскога камітэтаў КП(б)Б, абласнога і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Газета пачала друкавацца з восені 1944 г. У розныя гады рэдактарамі былі А.Ц. Васілеўскі, Д.М. Каплун, Г.В. Фралоў. З 1945 г. выходзіла 3 разы на тыдні. З 1948 г. паралельна пачала выходзіць аднайменная газета на рускай мове – «Большевитское знамя». У пасляваенныя гады друкавала матэрыялы пра аднаўленне гаспадаркі Полаччыны, поспехі ў с/г, эканоміцы, культуры, прамысловасці, будаўніцтве, артыкулы пра сацыялістычныя спаборніцтвы і іх пераможцаў. З № 234 ад 26(?).11.1952 г. газета стала называцца «Сцяг камунізму». Адпаведна і «Большевитское знамя» становіцца «Знаменем коммунизма».

**2.** «**Большэвіцкі шлях**», № 4 (3380), 29.06.1943. Орган Полацкага РК КП(б)Б. Рэдактар Ф.Т. Шэдаў. Падпольна, Полацкі р-н.

«Два гады Айчыннай вайны», с. 1.

«Што новага ў атрадах», с. 2.

«На фронтах Айчыннай вайны», с. 2.

«Навучанне байцу» (парады), с. 2.

«Частушкі», с. 2.

**ПИАЗ КП7-4319**

«**Большэвіцкі шлях**» – орган Полацкага РК КП(б)Б і райсавета. Такую назву Полацкая газета атрымала ў 1938 г. Апошні № 3377 (2.07.1941 г.) не паспеў выйсці, таму што пачалася Вялікая Айчынная вайна. У выніку з 26.06.1941 г. па 1.06.1943 г. газета не выдавалася. І толькі 2 чэрвеня 1943 г. у штабе 3-й Беларускай партызанскай брыгады, якую ўзначальваў А.Я. Марчанка, выйшаў першы падпольны нумар. У партызан была свая паходная друкарня. Рэдактарам газеты былі спачатку Ф.Т.Шэдаў (камісар 3-й Беларускай брыгады), потым П.А. Шадзеўскі (былы супрацоўнік Полацкай газеты). Газета выходзіла тыражом каля 250 экзэмпляраў. У ёй друкаваліся матэрыялы пра паспяховыя аперацыі партызан, звесткі з фронту, лісты воінаў-беларусаў да партызан і партызанак. У кастрычніку 1943 г. газета на некаторы час спыніла сваю дзейнасць. Да гэтага часу ў падпольнай друкарні выйшла 12 нумароў газеты і 12 лістовак. Супрацоўнікі газеты разам з партызанамі перайшлі лінію фронту і злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі. А ў снежні 1943 г. на вызваленай частцы тэрыторыі Полацкага раёна, у в. Засітніца Арлейскага с/с, з новай сілай загучаў голас «Большэвіцкага шляху». Падпольна было выдадзена 19 нумароў. Пасля вызвалення горада Полацка (4.07.1944 г.) газета стала амаль што з першых нумароў друкаваным органам РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў.

**3.** «**Большэвіцкі шлях**», № 8 (3385), 3.09.1943. Орган Полацкага РК КП(б)Б. Рэдактар Ф.Т. Шэдаў. Падпольна, Полацкі р-н.

«Звесткі з фронту», с. 1.

Артыкул пра подзвігі партызан і простых палачан на роднай зямлі, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/43**

**4.** «**Большэвіцкі шлях**», № 10 (3387), нядзеля, 26.09.1943. Орган Полацкага РК КП(б)Б. Рэдактар Ф.Т. Шэдаў. Падпольна, Полацкі р-н.

Матэрыялы аб падзеях на франтах, с. 1.

«Зварот да партызан», с. 1.

Артыкулы пра патрыётаў Полаччыны, актыўных удзельнікаў партызанскага руху, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3096**

**5.** «**Большэвіцкі шлях**», № 12 (3389), субота, 23.10.1943. Орган Полацкага РК КП(б)Б. Рэдактар Ф.Т. Шэдаў(?). Падпольна, Полацкі р-н.

«На фронтах Айчыннай вайны», с. 1.

«Устанаўленне ордэна Багдана Хмельніцкага», с. 1.

«Паспяховыя аперацыі віцебскіх партызан», с. 1.

«Рапартуем фронту», с. 2.

**ПІАЗ КП11-6904/8**

**6-8.** «**Большэвіцкі шлях**», № 1 (3392), субота, 1.01.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Выконваючы абавязкі адк. рэд. П.А Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«25 год Беларускай ССР», с. 1.

П. Івашчанка «На шляху адраджэння», с. 1.

«Такой была Беларусь» ( у даваенны перыяд), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3095**
**ПИАЗ КП7-4336**
**ПИАЗ КП7-4337**

**9-13.** «**Большэвіцкі шлях**», № 2 (3393), панядзелак, 10.01.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных.. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

Матэрыялы пра падзеі на фронце, с. 1-2.

«Аб дзяржаўным гімне Савецкага Саюза» (новы гімн на тэкст С.Міхалкова і Эль-Рэгістана з 15.03 1944 г.), с. 1.

П.Бел «Полацк кліча» (звесткі пра жыццё горада падчас акупацыі фашыстамі), с. 2.

**ПИАЗ КП1-390**
**ПИАЗ КП6-3175/1**
**ПИАЗ КП7-4333**
**ПИАЗ КП7-4322**
**ПИАЗ КП7-4323**

**14-16.** «**Большэвіцкі шлях**», № 4 (3395), пятніца, 21.01.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных.. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

Артыкул да дня смерці Леніна, с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

Матэрыялы па аднаўленню гаспадаркі на Полаччыне ў вызваленых вёсках, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/2**

**ПИАЗ КП7-4324**

**ПИАЗ КП7-4325**

**17-19.** «**Большэвіцкі шлях**», № 5 (3396), пятніца, 4.02.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Рыхтавацца да сяўбы», с. 1.

«Па нашаму раёну», с. 1.

«Нашы задачы», с. 2.

«Сыпны тыф», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/3**

**ПИАЗ КП7-4334**

**ПИАЗ КП7-4335**

**20-21.** «**Большэвіцкі шлях**», № 7 (3398), серада, 23.02.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і Райсавета.. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«26 год Чырвонай Арміі», с. 1.

«Подзвігі воінаў Чырвонай Арміі», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/4**

**ПИАЗ КП7-4332**

**22.** «**Большэвіцкі шлях**», № 10 (3401), чацвер, 9.03.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і Райсавета. Адказны рэдактар П.А.Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«У вызваленай Дрэтуні», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

Артыкулы пра аднаўленне гаспадаркі Полаччыны, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/5**

**23-24.** «**Большэвіцкі шлях**», № 11 (3402), нядзеля, 19.03.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і Райсавета. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Ліст т. Сталіну ад калгаснікаў і калгасніц Полацкага раёна», с. 1.

«На раённым партсходзе», с. 1.

Матэрыялы выступленняў на першым злёце перадавікоў с/г раёна», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/6**

**ПИАЗ КП2-1684/21**

**25.** «**Большэвіцкі шлях**», №12 (3432), нядзеля, 23.03.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і Райсавета. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

Артыкулы пра аднаўленне гаспадаркі на Полаччыне, с. 1-2.

Звесткі з фронту, с. 1.

«Саўгас «Палата» (жыццё пад акупацыяй намецкіх захопнікаў), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/7**

**26.** «**Большэвіцкі шлях**», № 13 (3404), панядзелак, 8.04.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«VI Сесія Вярхоўнага Совета БССР», с. 1.

Артыкулы пра аднаўленне гаспадаркі на Полаччыне, с. 2.

Звесткі з фронту, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/8**

**27-28.** «**Большэвіцкі шлях**», № 14 (3405), нядзеля, 9.04.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

Артыкулы пра аднаўленне гаспадаркі на Полаччыне, с. 1-2.

«Гітлераўцы – гэта звяры» (пра растрэл жыхароў в.Сасно), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/9**

**ПИАЗ КП7-4329**

**29.** «**Большэвіцкі шлях**», № 15 (3406), чацвер, 20.04.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў

працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Соцспаборніцтву – належны размах», с. 1.

«Абкружым клопатамі сем'і ваеннаслужачых», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/10**

**30-31.** «**Большэвіцкі шлях**», № 16 (3407), панядзелак, 1.05.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Усё для фронта, усё для перамогі», с. 1.

А.Ф. Мікрукоў «Не пасрамлю чэсці воіна», с. 2.

«Іх імёны авеяны славай», с. 2.

**ПИАЗ КП1-391**

**ПИАЗ КП6-3175/11**

**32.** «**Большэвіцкі шлях**», № 18 (3409), чацвер, 5.05.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Дзень большэвіцкага друку», с. 1.

«У першамайскія дні», с. 1.

«Георгій Скарына», с. 2.

«Большэвіцкі шлях», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/12**

**33-34.** «**Большэвіцкі шлях**», № 19 (3410), нядзеля, 7.05.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. Падпольна, Полацкі р-н.

«Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага №70», с. 1-2.

**ПИАЗ КП6-3175/13**

**ПИАЗ КП12-7131**

**35-37.** «**Большэвіцкі шлях**», № 20 (3411), чацвер, 6.07.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Ад Савецкага Інформбюро» (за 3.07.-4.07.), с. 1.

«Баі за Полацк», с. 1.

Бардоў, сакратар Полацкага РК КП(б)Б «Полацк зноў савецкі», с. 2.

Ліст з фронта В.М. Жураў «Дарагія мае землякі, палачане», с. 2.

«Час суровай расплаты настаў» (пра Тусналобаву З.М.), с.2.

**ПИАЗ КП7-4320**

**ПИАЗ КП7-4321**

**ПИАЗ КП6-3090**

**38-40.** «**Большэвіцкі шлях**», № 21 (3412), чацвер, 20.07.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б і раённага саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Газета прысвечана вызваленню г. Полацка ад фашысцкіх захопнікаў.

**ПИАЗ КП1-392**

**ПИАЗ КП6-3175/15**

**ПИАЗ КП7-4338**

**41.** «**Большэвіцкі шлях**», № 22 (3413), чацвер, 2.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Матэрыялы пра аднаўленне гаспадаркі ў г. Полацку, с. 1-2.

«Дзень радасці і лікавання» (звесткі пра агульны мітынг, прысвечаны вызваленню Полацка і раёна, які адбыўся 30.07.1944 г. на плошчы Свабоды), с. 1.

Матэрыялы пра Першую раённую нараду старшынь сельсаветаў і калгасаў, с. 2.

Артыкул пра Першы сход гарадскога партактыву (21.07.1944 г.), с. 2.

**ПИАЗ КП1-393**

**42-43.** «**Большэвіцкі шлях**», № 22 (3413) /23(3414)/, нядзеля, 6.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Ліст т. Сталіну ад палачан, с. 1.

Выступленні з мітынга (30.07.1944 г.), с. 2 .

**ПИАЗ КП1-394**

**ПИАЗ КП6-3175/16**

**44.** «**Большэвіцкі шлях**», № 23 (3414), чацвер, 10.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Добра падрыхтавацца да навучальнага года», с. 1.

«Паспяхова правядзём с/г работы», с. 1.

«Радасная праца на свабоднай зямлі», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 2.

«Па гораду і раёну», с. 1 .

«Дапамагайце наступаючай Чырвонай Арміі» (ліст дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Т.А. Воднева), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/17**

**45.** «**Большэвіцкі шлях**», № 24 (3415), нядзеля, 13.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Баявая задача дня», с. 1.

«Арганіцуем расчыстку і ўборку горада», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

Артыкул пра аднаўленне гаспадаркі Полаччыны, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/18**

**46.** «**Большэвіцкі шлях**», № 25 (3416), чацвер, 17.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Добра падрыхтавацца да навучальнага года», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

Артыкул пра аднаўленне гаспадаркі на Полаччыне, с. 2.

«Першы нумар насценнай газеты» (калгас «18 партз’езд», Шацілаўскага р-на), с. 2 .

**ПИАЗ КП6-3175/19**

**47.** «**Большэвіцкі шлях**», № 26 (3417), серада, 23.08.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Матэрыялы пра аднаўленне с/г на Полаччыне, с. 1.

«Слава сталінскім сокалам!» (пра ўрачысты сход, прысвечаны Дню авіяцыі), с. 2 .

**ПИАЗ КП6-3175/20**

**48.** «**Бальшэвіцкі шлях**», № 27 (3419), нядзеля, 3.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Міжнародны юнацкі дзень», с. 1.

«Навучальны год пачаўся», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

«Комсамольцам і моладзі г. Полацка» (ліст камсамольцаў-франтавікоў), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/21**

**49.** «**Бальшэвіцкі шлях**», № 28 (3420), пятніца, 8.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Нота Савецкага Урада Ўраду Балгарыі», с. 1.

«Да савецка-фінскіх адносін», с. 1.

«Па-бальшэвіцку правядзём асеннюю сяўбу!», с. 2.

«Узнагароджанне партызан Полаччыны», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/22**

**50.** «**Бальшэвіцкі шлях**», № 30 (3421), чацвер, 14.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Дошка гонару», с. 1.

«На раённай нарадзе», с. 1.

«Непарыўна дружба фронта і тыла», с. 2.

«Хутка адновім мясцовую прамысловасць», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/23**

**51.** «**Бальшэвіцкі шлях**», № 31 (3422), нядзеля, 17.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Неадкладна завяршыць хлебапастаўкі», с. 1.
«Дзяржава дапамагла» (дапамога калгасам), с. 1.
«На фашысцкай катарзе», с. 2.
«Пабудаваны новы млын», с. 2.
**ПИАЗ КП6-3175/24**

**52.** «**Большэвіцкі шлях**», № 32 (3423), чацвер, 21.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Зварот членаў сельскагаспадарчай арцелі імя Ільіча, Экіманскага с/с, с.1.
«Велічны помнік воінам-героям», с. 2.
**ПИАЗ КП6-3175/25**

**53-54.** «**Большэвіцкі шлях**», № 33 (3424), аўторак, 26.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Выходзьце на спаборніцтва», с. 1.
«Дастойна сустрэнем 27 гадавіну Кастрычніка», с. 1.
«Усе, як адзін выйдзем на аднаўленне горада, с. 2.
**ПИАЗ КП6-3175/26**
**ПИАЗ КП7-4330**

**55.** «**Большэвіцкі шлях**», № 34 (3425), субота, 30.09.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Споборніцтва імя 27 гадавіны Кастрычніка», с. 1.
«Коней і кароў пераключыць на зябліва», с. 2.
**ПИАЗ КП6-3175/27**

**56.** «**Большэвіцкі шлях**», № 35 (3426), субота, 6.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«На раённым партыйным сходзе» (1.10.1944 г.), с. 1-2.
**ПИАЗ КП1-395**

**57-58.** «**Большэвіцкі шлях**», № 36 (3427), аўторак, 10.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П. Шадзеўскі. г. Полацк.

Артыкул пра агульны гарадскі сход кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый г.Полацка, с. 1.

«Спаборніцтва імя 27 гадавіны Кастрычніка», с. 1.

«У горадзе і раёне», с. 2.

«Аб утварэнні Полацкай вобласці ў складзе БССР», с. 2.

«У педвучылішчы пачаліся заняткі, с. 2.

«У гарадской бібліятэцы», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/28**

**ПИАЗ КП7-4331**

**59-60.** «**Большэвіцкі шлях**», № 37 (3428), чацвер, 12.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Масава-палітычная работа ў вызваленых раёнах», с. 1.

І.Н. Беляўскі «Мы залечым раны» (пра самаадданую працу вагоннікаў), с. 2.

**ПИАЗ КП1-396**

**ПИАЗ КП6-3175/29**

**61.** «**Большэвіцкі шлях**», № 38 (3429), нядзеля, 15.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Больш зябі – больш хлеба», с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

«Нашы вытворчыя поспехі», с. 2.

«Школа партыйнага актыва», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/30**

**62-65.** «**Большэвіцкі шлях**», № 39 (3430), пятніца, 20.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«На пленуме гарадскога совета (18.10.1944 г.), с. 1.

Каракантан «Першыя крокі» ( пра агульны гарадскі нядзельнік – 15.10.1944 г.), с. 1.

К.Іванько «Вялікая сіла калгаснага ладу» (пра адраджэнне гаспадаркі ў калгасе ім.Ільіча, Экіманскага с/с), с. 2.

**ПИАЗ КП1-397**
**ПИАЗ КП6-3175/31**
**ПИАЗ КП7-4326**
**ПИАЗ КП8-4453**

**66-68.** «**Большэвіцкі шлях**», № 40 (3431), субота, 21.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Рашэнне Пленума Гарадскога Совета дэпутатаў Працоўных аб аднаўленні г. Полацка і працоўным удзеле насельніцтва ў аднаўленні горада», с. 1-2 .

**ПИАЗ КП1-398**
**ПИАЗ КП6-3175/32**
**ПИАЗ КП8-4452**

**69-70.** «**Большэвіцкі шлях**», № 41 (3432), серада, 25.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Дам больш хлеба фронту», с. 1.

«Насустрач 27 гадавіне Кастрычніка», с. 1 .

Артыкулы пра вынікі нядзельніка (22.10 1944) па аднаўленню горада, с. 2.

**ПИАЗ КП1-399**
**ПИАЗ КП6-3175/33**

**71.** «**Большэвіцкі шлях**», № 42 (3433), нядзеля, 29.10.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Памножым рады будаўнікоў Полацка» (пра другі нядзельнік па адбудове горада), с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

«Полацкім чыгуначнікам уручан чырвоны сцяг», с. 1.

Зварот «Да працоўных г. Полацка» лётчыкаў, якія вызвалялі горад, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/34**

**72-73.** «**Большэвіцкі шлях**», № 43 (3434), аўторак, 7.11.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Матэрыялы аб выніках паспяховага адраджэння г.Полацка з нагоды 27 гадавіны Вялікага Кастрычніка, с. 1-2.

В. Жыганаў «Слава партызан Полаччыны» ( пра гераічны бой партызан за саўгас «Палата»), с. 2.

**ПИАЗ КП1-400**

**ПИАЗ КП6-3175/35**

**74.** «**Большэвіцкі шлях**», № 45 (3435), аўторак, 14.11.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, з нагоды 27 гадавіны Кастрычніка, с. 1.

«Дні радасці і лікавання», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/36**

**75.** «**Большэвіцкі шлях**», № 46 (3436), нядзеля, 26.11.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Зварот работнікаў магнітагорскага і кузнецкага камбінатаў, с. 1-2.

«Больш лесу прамысловасці і транспарту», с. 2.

«У фонд перамогі», с. 2.

Звесткі з фронту, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/37**

**76.** «**Большэвіцкі шлях**», № 47 (3437), пятніца, 1.12.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Больш лесу краіне», с. 1.

«Забяспечым жывёле добрую зімоўку», с. 2.

«У адказ на зварот металургаў», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/38**

**77.** «**Большэвіцкі шлях**», № 48 (3438), серада, 6.12.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Звесткі з фронту, с. 1.

Матэрыялы да Дня канстытуцыі, с. 1.

«Зноў адчынілі дзверы школы», с. 2.

«Дом інвалідаў», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/39**

**78.** «**Большэвіцкі шлях**», № 49 (3439), аўторак, 12.12.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Зварот калгаснікаў с/г арцелі «Чырвоная Ніва», Кушлікоўскага с\с, Полацкага раёна, с. 1.

Матэрыялы пра аднаўленне гаспадаркіПолаччыны, с. 1-2.

**ПИАЗ КП6-3175/40**

**79.** «**Большэвіцкі шлях**», № 50 (3440), серада, 20.12.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Звесткі з фронту, с. 1.

Пастанова Выканкома Полацкага аблсавета дэпутатаў працоўных і бюро абкома КП(б)Б, с. 1.

Артыкулы пра аднаўленне гаспадаркі Полаччыны, с. 1-2.

«Пісьмо з фронта», пра подзвіг палачаніна Дарошчанка І.З., жыхара в. Старына, Васільеўскага с/с, с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/41**

**80.** «**Большэвіцкі шлях**», № 51 (3441), аўторак, 26.12.1944. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Адновім грамадскую жывёлагадоўлю» (з перадавога артыкула «Звязды»), с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

А. Крывянкоў «Дадзім больш вырабоў з мясцовай сыравіны», с. 2.

**ПИАЗ КП6-3175/42**

**81.** «**Большэвіцкі шлях**», № 4 (3445), нядзеля, 21.01.1945. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

Артыкул да дня смерці Леніна, с. 1.

«На франтах Айчыннай вайны», с. 1-2.

«За паўгода свабоднай працы» ( на справаздачным сходзе ў калгасе), с. 2.

**ПИАЗ КП6-3176/1**

**82.** «**Большэвіцкі шлях**», № 9 (3450), аўторак, 20.02.1945. Орган Полацкага РК КП(б)Б, раённага і гарадскога саветаў дэпутатаў працоўных. Адказны рэдактар П.А. Шадзеўскі. г. Полацк.

«Акружым паўсядзённымі клопатамі і ўвагай сем'і абаронцаў Радзімы», с. 1.

Узнагароджанне ордэнамі партыйных і савецкіх работнікаў Полаччыны, с. 1.

Звесткі з фронту, с. 1.

8) Я. Усікаў «У роднай хаце» (кн. П. Броўкі), Р. Няхай «Салют у Мінску» (кн. А. Вялюгіна).

**КП8-4344/431.**

**30.** Беларусь № 12, 1947 г.32 с.

*Склад.*

1) Л. Рудзіцкі «Знамянальная гадавіна» (да 25-годзя ўтварэння СССР).

2) Вершы: П. Панчанкі, А. Зарыцкага, Э. Агняцвет, А.Вялюгіна.

3) Проза: Т. Хадкевіча, І. Шамякіна, К. Чорнага.

4) Г. Таран «Кандрат Крапіва», У. Карпаў «Ідэі патрыятызму ў беларускай літаратуры».

5) Г. Гінзбург «Баі пад Віцебскам у 1812».

6) С. Нісневіч «Беларуская савецкая музыка за 30 год», А. Есакоў «Песняр сучаснасці» (артыст У. Крыловіч).

7) –

**КП-84344/433**
**КВФ4-1773/98**

**31.** Беларусь № 1, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: М. Калачынскага, М. Танка, А. Вялюгіна, Э. Агняцвет, А. Астапенкі.

3) Проза: І. Гурскага, У. Краўчанкі, А. Міронава.

4) Д. Лебедзеў «Творы Леніна і Сталіна на беларускай мове», А. Эльман «Аб партыйнасці літаратуры», У. Карпаў «Воін і творца» (тв-ць беларускіх пісьменнікаў).

5) –

6) А. Есакоў, Б. Смольскі «Лунінецкі народны хор», М.Модэль «Аб тэатральнай моладзі».

7) І. Мележ «Апавяданні» (кн. І. Грамовіча), У. Ігнатаў «Сад» (кн. А. Кулакоўскага).

**КП8-4344/434**
**КВФ4-17733/99**

**32.** Беларусь № 2,1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) Н. Грашчаннікаў «Пачэсны абавязак совецкай інтэлігенцыі».

2) Вершы: М. Танка, А. Вялюгіна, К. Кірэенкі.

3) Проза: П. Пестрака.

4) Я. Герцовіч «Тэма рабочага класа ў беларускай совецкай прозе», М. Смолкін «Самуйлёнак-журналіст».

5) М. Красоўскі «Гераічная абарона ў Брэсце».

6) –

7) Я. Усікаў «Разам з народам» (кн. М. Засіма «Ад шчырага сэрца»).

**КП8-4344/435**
**КВФ4-1773/100**

**33.** Беларусь № 3, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) А. Ус «Вялікая сіла», «Бюджэт рэспублікі».

2) Вершы: Н. Парукова, М. Пянкрата, М. Калачынскага, М. Танка, А. Вялюгіна, В. Матэвушава, І. Цімашкова.

3) Проза: В. Гільбурда, К. Папкоўскага, Т. Хадкевіча.

4) «Беларуская савецкая літаратура за 1947 г.»

5) Н. Бараноўская, С. Левіна «Беларускія партызаны», М.Шкляр «50-годдзе першага з'езда РСДРП»

6) І. Гутараў «Праблема формы і зместу ў мастацтве», М.Модэль» «Юбілейныя спектаклі і іх рэжысура», У. Няфёд «Вынікі конкурса на лепшую савецкую п'есу».

7) У. Агіевіч «Пасля навальніцы» (кн. К. Кірэенкі), Р. Няхай «Нёманскія казакі» (кн. Я. Брыля).

Забруджванне. На 1-й с. вокладкі штампы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР.

**КВФ4-1773/101**

**34.** Беларусь № 4, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) І. Цімчук «Прамысловасць Беларусі ў 1948».

2) Вершы: М. Танка, К. Кірэенкі, І. Юрчанкі.

3) Проза: І. Грамовіча.

4) –

5) С. Шчуцкі «Музей Айчыннай вайны» (г. Мінск).

6) –

7) У. Карпаў «На родных гонях» (кн. І. Гурскага), А. Вялюгін «Арлiная крыніца» (кн. А. Зарыцкага).

**КП8-4344/436**
**КВФ4-1773/99**

**35.** Беларусь № 5, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: М. Лужаніна, К. Кірэенкі.

3) Проза: В. Лівенцава, К. Папкоўскага.

4) Н. Красоўскі «Ленін і Сталін – арганізатары большэвіцкага друку», А. Арцем'еў «А.Н. Астроўскі і савецкі тэатр», М. Клімковіч «З песняй барацьбы» (тв-ць М. Танка).

5) –

6) А. Есакоў «Ганцавіцкі харавы калектыў».

7) Р. Няхай «Гарачы жнівень» (кн. І. Мележа), М. Гамолка «Апавяданні» (кн. М. Лупсякова).

Забруджванне. На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/437**

**КВФ4-1773/102**

**36.** Беларусь № 6, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Пестрака, А. Пысіна, П. Броўкі.

3) Проза: М. Даніленкі.

4) У. Няфёд «Крытычныя традыцыі Белінскага», М.Клімковіч «М. Горкі і Я. Купала», А. Якімовіч «Янка Маўр».

5) Е. Сераброўская «Вялікі сын рускага народа» (Бялінскі), І. Родзін «Філасофія і эстэтычныя погляды Белінскага», А. Рабчынскі «М.І. Калінін аб комуністычным выхаванні».

6) –

7) І. Кудраўцаў «Паэма аб правадыру» (кн. Г. Леанідзе «Маленства» з эпапеі «Сталін»).

Забруджванне. Надрыў па карашку (14,5 см). На 1-й с. вокладкі штампы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, надпісы.

**КВФ4-1773/104**

**37.** Беларусь № 7, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) М. Аслоўскі «Архітэктура новага Мінска».

2) Вершы: А. Пысіна, М. Аўрамчыка, К. Кірэенкі, А.Вялюгіна.

3) Проза: М. Лынькова, Н. Пятніцкага.

4) М. Лобан «Думкі пра нашу мову», І. Родзін «Чарнышэўскі – змагар і мысліцель», У. Агіевіч «Пясняр совецкага патрыятызма» (У. Маякоўскі), У. Шахавец «Паэзія В. Таўлая».

5) Г. Улаеў «Пяты удар» (да 4-ай гадавіны вызвалення Беларусі).

6) І. Гутараў «Маркс-Энгельс аб эстычных успрымання і мастацкай творчасці».

7) –

Забруджванне. На 1-й с. вокладкі штамп Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, надпісы.

**КВФ4-1773/105**

**38.** Беларусь № 8, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) Памяці А.А. Жданава, П. Кірушын «Ватыкан-закляты вораг Совецкага Саюза і дэмакратыі».

2) Вершы: А. Русака, А. Межырава.

3) Проза: М. Вішнеўскага, М. Паслядовіча.

4) Н. Сігналаў «Магутны сродак комуністычнай асветы», Айзеншток «Сведчанне вялікай дружбы» (Анталогія беларускай паэзіі ў перакладзе ленінградскіх паэтаў), М. Смолкін «Рысы нашага сучасніка» (Вобраз новага чалавека ў творах рускай літаратуры 1947 г.)

5) П. Ліпіла «М.В. Фрунзе ў Беларусі і яго роля ў падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэвалюцыі».

6) М. Модэль «Мастак класічнага танца» (З. Васільева).

7) Я. Усікаў «Грозны абвінаваўчы дакумент супроць фашыскіх забойцаў» (кн. «Ніколі не забудзем»)

Забруджанне. На 1-й с. вокладкі штампы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР.

**КВФ4-1773/106**

**39.** Беларусь № 9, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) М.Клімковіч «Да 9-й гадавіны ўз’яднання беларускага народа», А.Рабчынскі «Сацыялістычнае спаборніцтва магутны рычаг будаўніцтва комуністычнага грамадтсва», А. Аўчыннікаў «Марксізм-ленінізм аб рэлігіі».

2) Вершы: М. Лужаніна, А. Бялевіча, П. Прыходзькі, С.Гаўрусёва.

3) Проза: В. Вольскага, А. Міронава, М. Ракітнага.

4) У. Агіевіч «Паэзія гераічнага Ленінграда», С. Александровіч «Вялікі дзень» К. Чорнага».

5) –

6) У. Няфёд «Выдатны актор» (Г.П. Глебаў), М. Модэль «На шляху перабудовы» (Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета).

7) –

Забруджванне. На 1-й с. вокладкі штамп Дзяржаўнай бібліятэкі БССР.

**КВФ4-1773/107**

**40.** Беларусь № 10, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) І. Росман «Магутная ідэйная зброя большэвізма», С.Умрэйка «Народная асвета ў БССР за 30 год», І. Цімчук «Важнейшая народна-гаспадарчая праблема», І. Чарняўскі «Арлінае племя» (да 30-годдзя ВЛКСМ).

2) Вершы: К. Кірэенкі, А. Вялюгіна, У. Ліўшыца, М. Калачынскага.

3) Проза: І. Грамовіча, Я. Брыля, В. Казлова.

4) Я. Зомерфельд «Драматычныя паэмы М. Клімковіча».

5) –

6) М. Модэль «Юбілей Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага тэатра», А. Атрошчанка «Старэйшы рускі тэатр у Мінску».

7) Я. Усікаў «Добры дзень» (кн. А. Астрэйкі).

Забруджванне. На 1-й с. вокладкі штамп бібліятэкі ЦК КП(б)Б.

**КВФ4-1773/108**

**41.** Беларусь № 11, 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) П. Сяльчонак «XXXI год Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі», Н. Каменская «Утварэнне Беларускай совецкай дзяржавы», І. Чарняўскі «Сельская гаспадарка да 30-годдзя БССР».

2) Вершы: А. Менжырава, М. Аўрамчыка.

3) Проза: І. Шамякіна, І. Гурскага, А. Стаховіча.

4) З. Матузаў «Выданне кніг у Беларусі», Н. Кудраўцаў «Калгасная тэматыка ў беларускай літаратуры».

5) М. Лобан «Мінск сёння».

6) –

7) –

Забруджванне. На 1-й с. вокладкі штамп бібліятэкі.

**КВФ4-1773/111**

**42.** Беларусь № 12 1948 г. 32 с.

*Склад.*

1) Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі», А. Колышкін «Дасягненні прамысловасці БССР за 30 год», І. Качура «Механізацыя соцыялістычнай сельскай гаспадаркі».

2) Вершы: А. Міцкевіча, К. Кірэенкі, А. Русака.

3) Проза: М. Ткачова, І. Мележа, П. Кавалёва.

4) У. Агіевіч «Паэзія жыцця» (тв-ць М. Танка).

5) З. Капыскі «Палымяны барацьбіт за комунізм» (С.М.Кіраў), П. Кабзарэўскі і А. Іцігін «Ленінград сёння».

6) Я. Рамановіч «Тэатры рэспублікі да трыццацігоддзя БССР», І. Ніснeвіч «30 год музычнай культуры Совецкай Беларусі».

7) –

Забруджванне, загіны вуглоў, надрывы па карашку.

**КВФ4-1773/112**

**43.** Беларусь № 1, 1949 г. 48 с.

Выпуск прысвечаны 30-годдзю ўтварэння БССР.

*Склад.*

1) К. Крапіва «Аб характары беларуса».

2) Вершы: А. Куляшова, А. Суркова, П. Броўкі, М. Лужаніна.

3) Проза: Я. Коласа, П. Глебкі.

4) У. Агіевіч «Літаратура, народжаная Вялікім Кастрычнікам».

5) «Вялікаму Сталіну ад беларускага народа».

6) –

7) –

Забруджванне. На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/439**

**44.** Беларусь № 2, 1949 г. 32 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Вялюгіна, К. Кірэенкі, П. Панчанкі, Х.Жычкі.

3) Проза: Я. Брыля.

4) У. Агіевіч «Пераможны рух наперад» (Пісьменнікі БССР, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі да 30-годдзя БССР).

5) В. Луцэвіч «Літаратурны музей Я.Купалы».

6) А. Арцем’еў «Высокая ўзнагарода» (Працаўнікі мастацтва, узнагароджаныя ордэнамі да 30-годдзя БССР).

7) –

Забруджванне. На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/440**

**45.** Беларусь № 6, 1949 г. 32 с.

*Склад.*

1) Е. Войніч «Беларуская савецкая література на ўздыме», П. Броўка «Да 2-га з’езда савецкіх пісьменнікаў Беларусі», М. Танк «Кангрэс прыхільнікаў міру».

2) Вершы: А.С. Пушкіна, А. Вялюгіна, Я. Купалы, В. Таўлая.

3) Проза: М. Горкага, М. Лупсякова.

4)П. Глебка «А.С. Пушкін і беларуская літаратура», М.Клімковіч «Вобраз І.В. Сталіна ў паэзіі Я. Купалы».

5) В. Раждзественскі «Па пушкінскіх месцах Ленінграда».

6) У. Няфёд «Пушкін і тэатр».

7) М. Гарулёў «Андрэйка» (кн. П. Кавалёва), Я. Брыль «Агні пяцігодкі».

**КП8-4344/441**

**46.** Беларусь № 9, 1949 г. 32 с.

*Склад.*

1) І. Шамякін «Барацьба за мір і дэмакратыю».

2) Вершы: М. Васілька, А. Бялевіча, М. Калачынскага.

3) Проза: І. Гурскага.

4) М. Клімковіч «Тэма партыі ў творах сучаснай літаратуры», М. Чавускі «Сатыра і гумар – зброя бальшэвіцкага друку».

5) І. Родзін «Вялікі сын рускага народа» (Радзішчаў).

6) У. Няфёд «Сучасная п'еса на сцэне тэатраў БССР»

7) С. Майхровіч «Вяснянка»(кн. Т. Хадкевіча), Я. Усікаў «Гартаванне» (кн. А. Кулакоўскага).

**КП8-4344/442**

**КВФ4-1773/115**

**47.** Полымя № 1, 1945 г. 163 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: Я. Коласа, М. Танка.

3) Проза: У. Краўчанкі, А. Кучара.

4) А. Нявада «Вялікі геній» (А.С. Грыбаедаў), М. Ларчанка «І.А. Крылоў».

5) Ф. Канстанцінаў «Славянскія плямёны – продкі беларускага народа».

6) –

7) М. Святланкін «Кніга М. Лынькова «Астап».

**КП8-4344/396**

**48.** Полымя № 2-3, 1945 г. 174 с.

*Склад.*

1) Канферэнцыя кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ў Крыму.

2) Вершы: Я. Коласа, М. Лужаніна, В. Віткі.

3) Проза: У. Фінкеля, У. Краўчанкі, А. Якімовіча, І. Мележа, І. Грамовіча.

4) М. Клімковіч «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч», А. Маслоўскі «Вершы аб Радзіме» (тв-ць П. Броўкі).

5) Ул. Перцаў «Утварэнне тэўтонскага ордэна».

6) –

7) –

**КП8-4344/397**

**49.** Полымя № 5-6, 1945 г. 112 с.

*Склад.*

1) Зварот І.В. Сталіна да народа.

2) Вершы: П. Глебкі, М. Танка, П. Пестрака, А. Бялевіча, К. Кірэенкі, А. Астапенкі, А. Куляшова, П. Панчанкі.

3) Проза: К. Чорнага, Я. Зазекі, А. Платнера.

4) І. Гутараў «Паэтычнае майстэрства Маякоўскага».

5) Ф. Канстанцінаў «Удзел беларусаў у Грунвальдскай бітве».

6) М. Модэль «Опера аб партызанскай вайне».

7) –

**КП8-4344/398**

**50.** Полымя № 7-8, 1945 г. 170 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: Я. Купалы, М. Калачынскага, М. Жука.

3) Проза: М. Лынькова, Я. Садоўскага.

4) Л. Бэндэ «Я. Купала і беларускі фальклор», Л. Фіглоўская «Радзіма і народ у творчасці Я. Купалы.», М. Ларчанка «Патрыятычная тэма ў творах Я. Купалы», В. Вітка «Пясняр дружбы народаў» (Я. Купала).

5) Ф. Дамінікоўскі «Выдатныя географы-беларусы».

6) –

7) –

**КП8-4344/399**

**51.** Полымя № 9, 1945 г. 162 с.

*Склад.*

1) Зварот т. І.В. Сталіна да народа. (з нагоды капітуляцыі Японіі).

2) Вершы: М. Машары, П. Панчанкі, Э. Агняцвет.

3) Проза: К. Крапіва «Мілы чалавек».

4) П. Глебка «Мастацкая літаратура Заходняй Беларусі», Л. Бэндэ «Новыя матэрыялы аб Янку Лучыне».

5) Ул. Перцаў «Кастусь Каліноўскі».

6) М. Модэль «Выдатная артыстка» (Л.П. Александроўская).

7) –

**КП8-4344/400**

**52.** Полымя № 10, 1945 г. 123 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Пестрака, П. Панчанкі, А. Зарыцкага, М.Клімковіча, М. Машары.

3) Проза: С. Гусеў «Гвардзейцы Мацыеўскага».

4) Л. Бераг «Да пытання аб волатах-асілках старажытных беларускіх паданняў», У. Фінкель «Змітрок Бядуля».

5) Ул. Перцаў «Кастусь Каліноўскі».

6) –

7) –

**КП8-4344/401**

**53.** Полымя № 1, 1945 г. 126 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Панчанкі, В. Матэвушава, П. Пранузы.

3) Проза: Я. Маўра, І. Мележа, Я. Зазекі, М. Лупсякова; М. Садковіч, Я. Львоў «Георгі Скарына».

4) М. Палякова «Дастаеўскі – мастак», М. Лынькоў «Задачы беларускай літаратуры ў перыяд аднаўлення і развіцця гаспадаркі і культуры Беларусі».

5) –

6) –

7) –

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/402**

**54**. Полымя № 2-3, 1946 г. 192 с.

*Склад.*

1) Прамова т. І.В. Сталіна на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі г. Масквы 9 лютага 1946 г.

2) Вершы: П. Панчанкі, В. Вольскага, В. Таўлая, М. Лужаніна.

3) Проза: В. Вольскага; М. Садковіч і Я. Львоў «Георгі Скарына».

4) У. Карпаў «Сатырык і драматург» (Крапіва), Ц. Крысько «Творчасць маладых пісьменнікаў» (П. Панчанкі, К. Кірэенкі, П. Пранузы, В. Матэвушава, М. Гамолкі і інш.).

5) М. Лынькоў «Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР» (П.К.Панамарэнка), М. Лужанін «Чалавек высокіх вартасцей» (К. Варашылаў), П. Броўка «Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР народны паэт Я. Колас».

6) –

7) –

Адарванасць вокладкі, на першай старонцы вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/403**

**55.** Полымя № 4, 1946 г. 164 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Глебкі, Л. Украінкі, А. Зарыцкага, Р. Сабаленкі, А. Коршака, В. Матэвушава.

3) Проза: П. Пестрака.

4) А. Астапенка «Памяці маладога паэта»(А. Коршака), Л. Фіглоўская «Творчасць Я. Коласа ў дні Айчыннай вайны і перамогі», Л. Бараг «Казачнік Рэдкі».

5) –

6) –

7) І. Астахаў «Прыгоды цымбал» (А. Куляшова.)

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/404**

**56.** Полымя № 5, 1946 г. 173 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Зарыцкага, А. Бачылы, А. Астапенкі, М. Гамолкі.

3) Проза: К. Чорнага, С. Свірыдава. П. Кавалёва.

4) М. Клімковіч «Першая беларуская паэтэса», У. Фінкель «Малады Шолам-Алейхем»

5) –

6) –

7) Я. Казека «Новая кніга вершаў П. Панчанкі», І. Мележ «Апавяданні пра вайну».

Расклееныя кніжны блок. На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/405**

**57.** Полымя № 6, 1946 г. 173 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: М. Танка, Э. Агняцвет, В. Саянава, Н. Брауна, С. Бытавога, Я. Купалы.

3) Проза: М. Клімковіча («Георгі Скарына»), У. Карпава, Я. Купалы.

4) У. Карпав «Драматургія Я. Купалы», Я. Хлябцэвіч «М. Горкі, ваенкоры і пачынаючыя чырвонаармейскія пісьменнікі».

5) Ф. Дамінікоўскі «Жыццё і праца Соф’і Кавалеўскай».

6) –

7) Я. Шарахоўскі «Поўдзень» (кн. В. Віткі).

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/406**

**58.** Полымя № 7, 1946 г. 148 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Бялевіча, Н. Пашкевіча, В. Матэвушава.

3) Проза: Я. Шарахоўскага, М. Клімковіч («Георгі Скарына»), Г. Шчарбатава.

4) К. Корсакс «Літоўская літаратура ў Айчыннай вайне».

5) –

6) –

7) –

Страчаны старонкі 27-39, 125-126, 137-144, 149-150. На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/407**

**59.** Полымя № 8-9, 1946 г. 150 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: М. Танка, А. Бялевіча, А. Зарыцкага.

3) Проза: Я. Шарахоўскага, І. Шамякіна. Г. Шчарбатава.

4) Л. Бэндэ «Недрукаваныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча», С. Майхровіч «К.А. Буйла».

5) –

6) М. Кацар «Жывапіс Беларусі».

7) Г. Бярозкін «Далёкія станцыі», К. Губарэвіч «Аб мастацкай праўдзе» (кн. М. Клімковіча «Лясное возера»).

Частковая адарванасць кніжнага блока ад карашка. На 1с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/408**

**60.** Полымя № 10, 1946 г. 166 с.

*Склад.*

1) Даклад т. Жданава аб часопісах «Звезда» і «Ленінград».

2) Вершы: Я. Коласа, П. Броўкі, А. Вялюгіна.

3) Проза: І. Мележа, Ю. Рудзько, П. Кавалёва.

4) А. Кучар «Новая зямля» Я. Коласа, Г. Базыленка «Вобразы і кампазіцыя паэмы «Адплата» Я. Коласа».

5) –

6) –

7) –

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/409**

**61.** Полымя № 11, 1946 г. 140 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: Я. Коласа

3) Проза: Р. Няхая, Т. Хадкевіча.

4) А. Кучар «Змітрок Бядуля», У. Карпаў «Нараджэнне характару» (тв-ць К. Чорнага), В. Фарбераў «Паэт-воін» (А. Куляшоў).

5) –

6) –

7) Я. Шарахоўскі «За сваю Айчыну».
**КП8-4344/410**

**62.** Полымя № 12, 1946 г. 158 с.

*Склад.*
1) –
2) Вершы: М. Някрасава, Я. Коласа, М. Лужаніна.
3) Проза: Р. Няхая, А. Платнера.
4) П. Броўка «Творчасць П. Глебкі», «Вялікі рускі паэт-грамадзянін» (Някрасаў), М. Клімковіч «Паэт вялікага сэрца» (з. Бядуля).
5) –
6) Модэль «Нататкі пра артыстку» (І.Ф. Ждановіч).
7) Р. Няхай «На сурмах баравых» (кн. М. Сурначова).
Расшыты кніжны блок.
**КП8-4344/411**

**63.** Полымя № 1, 1947 г. 114 с.

*Склад.*
1) Вялікая ўрачыстасць. (Выбары ў Вярхоўны Совет БССР). П. Глебка «Кандыдат ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Міхась Ціханавіч Лынькоў». М. Модэль «Кандыдат ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Кандрат Кандратавіч Крапіва».
2) Вершы: М. Танка, Я. Коласа, П. Тычыны, М. Рыльскага, М. Бажана, Л. Первамайскага, У. Сасюры, А. Малышкі, М.Машары, М. Лужаніна, В. Матэвушава.
3) Проза: Ю. Рудзько, Ц. Гарбунова, А. Зямцова.
4) Я. Шарахоўскі «Беларуская паэзія ў 1946 г.», К. Губарэвіч «Паэзія маладых», Л. Бераг «Беларуская фантастычная казка».
5) –
6) –
7) К. Левановіч «Па пройдзеных шляхах» (кн. Л. Токарава «В походе»).
Частковая страта 4 с. вокладкі, плямы.
**КП8-4344/455**

**64.** Полымя № 2, 1947 г. 129 с.

*Склад.*

1) П. Глебка «Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і БССР Якуб Колас». Я. Шарахоўскі «Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Максім Танк». У. Карпаў «Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Аркадзь Куляшоў».

2) Вершы: Я. Коласа, А. Зарыцкага, А. Жаўрука, А. Ушакова, А. Коршака, Г. Шведзіка, С. Ляльчука.

3) Проза: Т. Хадкевіча, П. Пестрака, Г. Шчарбатава.

4) Я. Шарахоўскі «Біяграфія Я.Купалы», У. Карпаў. «У палескай глушы» і «У глыбі Палесся» Якуба Коласа.

5) –

6) –

7) А. Вялюгін «Вершы Н. Тарас» (кн. Н. Тарас «Суніцы»).

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/456**

**65.** Полымя № 3, 1947 г. 105 с.

*Склад.*

1) Ф. Шмыгаў «Пытанні аб міжнароднай апецы»

2) Вершы: А. Зарыцкага, Я. Коласа, Д. Осіна.

3) Проза: Т. Хадкевіча, Т. Тарасава.

4) В. Перцаў «Ламаносаў як грамадскі дзеяч і гісторык», Я. Мазалькоў «К. Чорны», Я. Шарахоўскі «Біяграфія В. Дуніна-Марцінкевіча».

5) –

6) М. Модэль Пошукі мастацкай праўды» (арт. І.М. Балоцін)

7) Р. Шкраба «У баку надзённых задач» (альманах «Отчизна»).

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/457**

**66.** Полымя № 4, 1947 г. 130 с.

*Склад.*

1) Т. Хадкевіч «Мінск будуецца».

2) Вершы: А. Астрэйкі, Я. Коласа, М. Гамолкі, А. Зарыцкага, П. Пранузы, А. Вялюгіна.

3) Проза: К. Чорнага, А. Ганчара, П. Кабзарэўскага.

4) У. Карпаў «Сталасць» (агляд л-ры), М. Красоўскі «Грыбаедаў ў Брэсце».

5) –

6) –

7) Р. Шкраба «У палоне ўплываў» (кн. А. Русака «На родных палетках»).

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч».

**КП8-4344/458**

**67.** Полымя № 5, 1947 г. 130 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Броўкі, А. Зарыцкага, М. Хрысціча.

3) Проза: К. Чорнага, Ю. Рудзько, П. Глебкі.

4) Я. Шарахоўскі «Максім Багдановіч», М. Модэль «Рысы сучаснага героя», І. Семпер «Нататкі пра эстонскую літаратуру», М. Смолкін «Наша ніва» і беларуская літаратура», Л. Бэндэ «Новае аб Ф. Багушэвічу».

5) –

6) –

7) У. Карпаў «Апавяданні Янкі Брыля».

**КП8-4344/459**

**68.** Полымя № 6, 1947 г. 130 с.

*Склад.*

1) Памяці Міхаіла Іванавіча Калініна. М. Модэль «Крывёю сэрца» (Рэспубліканскі сход пісьменнікаў Беларусі).

2) Вершы: А. Астрэйкі, Т. Масенкі, А. Вялюгіна, М. Аўрамчыка, В. Матэвушава.

3) Проза: К. Чорнага, І. Грамовіча, М. Вішнеўскага, П.Кавалёва.

4) А. Александровіч «Аб дакастрычніцкай творчасці Янкі Купалы», Я. Шарахоўскі «Янка Купала – выдатны савецкі паэт», У. Карпаў «Драматызаваныя паэмы Янкі Купалы», Я. Зазека «Прыпеўкі беларускіх партызан».

5) –

6) –

7) –

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/460**

**69.** Полымя № 7, 1947 г. 165 с.

*Склад.*

1) «Да новых твочых поспехаў»

2) Вершы літоўскіх паэтаў, А. Зарыцкага.

3) Проза: А. Стаховіча, М. Клімковіча («Георгій Скарына»).

4) –

5) А. П'янкоў «Паўстанне беларускіх сялян пад кіраўніцтвам Дзяніса Мурашкі».

6) К. Губарэвіч «Важнейшае з усіх мастацтваў» (беларуская кінематаграфія).

7) А. Вялюгін «Шчырае, свежае слова.» (кн. Д. Кавалёва «Далекие берега»).

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/461**

**70.** Полымя № 8, 1947 г. 105 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Бялевіча, А. Вялюгіна, П. Прыходзькі.

3) Проза: М. Лупсякова, апавяданні з кнігі «Беларускія дзеці ў гады вялікай Айчыннай вайны».

4) М. Вішнеўскі, Я. Герцовіч «Слаўны шлях» (газета «Звязда»), М. Лынькоў «Ідэі патрыятызма ў беларускай дарэвалюцыйнай і савецкай літаратуры», К. Краўлтінь «Латышская савецкая літаратура пасля рашэнняў ЦК ВКП(б).

5) –

6) –

7) У. Васілевіч «Апавяданні Кузьмы Чорнага».

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/462**

**71.** Полымя № 9, 1947 г. 127 с.

*Склад.*

1) Е. Бугаёва «Да восьмай гадавіны ўз'яднання беларускага народа ў адзінай совецкай дзяржаве», Н. Каменская «Масква – сталіца СССР».

2) Вершы: М. Машары, Э. Агняцвет, А. Вялюгіна. М. Клімковіча, А. Бялевіча, А. Стаховіча, М. Машары, А. Зарыцкага.

3) Проза: Я. Брыля.

4) С. Майхровіч «Поэтычная творчасць Петруся Броўкі», М. Смолкін «Ля вытокаў сучаснай беларускай прозы».

5) –

6) М. Модэль «У змаганні за высокаідэйны тэатр».

7) А. Вялюгін «Шторм у шклянцы» (кн. А. Астапенкі «Выпрабаванне»), А. Есакоў «Ірынка» К. Чорнага.

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/463**

**72.** Полымя № 10, 1947 г. 127 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Зарыцкага, М. Лужаніна, А. Вялюгіна, К.Буйла, А. Бурдзель, А. Астрэйкі, Х. Жычкі.

3) Проза: І. Шамякіна, І. Мележа, А. Зямцова, Я. Брыля.

4) Я. Засека «Вобразы Леніна і Сталіна ў паэзіі беларускіх партызан».

5) –

6) А. Есакоў, Б. Смольскі «Народная песенная культура Беларусі».

7) М. Гамолка «Вершы Анатоля Вялюгіна».

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/464**

**73.** Полымя № 11, 1947 г. 128 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: П. Глебкі, П. Броўкі, М. Машары, А. Зарыцкага, К. Кірэенкі, А. Вялюгіна, М. Калачынскага, А. Астапенкі, П. Прыходзькі.

3) Проза: А. Міронава, М. Аляксандрава.

4) Я. Шарахоўскі «Белоруская совецкая літаратура».

5) –

6) Б. Смольскі «Музычная культура беларускага народа».

7) У. Карпаў «Выбраныя апавяданні» Міхася Лынькова.

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», надрывы па карашку (3 см, 4 см)

**КП8-4344/465**

**74.** Полымя № 12, 1947 г. 128 с.

*Склад.*

1) –

2) Вершы: А. Астрэйкі, М. Калачынскага, А. Платнера, Г.Камянецкага.

3) Проза: В. Віткі, М. Садковіч, Я. Львоў «Георгі Скарына»

4) А. Кучар «Кандрат Крапіва – драматург», У. Карпаў «Вялікі ўздым» (беларуская савецкая літаратура).

5) А. П'янкоў «Уладзімір Нікалаевіч Перцаў», М. Грынблат «Нікалай Міхайлавіч Нікольскі».

6) –

7) –

На 1 с. вокладкі ўверсе надпіс «Матусевіч», плямы.

**КП8-4344/466**

# Выданні друкарні Віленскай езуіцкай акадэміі ў фондах НПГКМЗ

*І.А. Шупенька*

Друкарня Віленскай езуіцкай акадэміі была створана на аснове друкарскай маёмасці Брэсцкіх друкарняў Мікалая Радзівіла Чорнага, якую перавёз у Вільню Мікалай Крыштоф Радзівіл (Сіротка), былы кальвініст, які вярнуўся да каталіцызму. Ён перавёз Брэсцкую друкарню свайго бацькі ў Вільню і перадаў яе езуіцкаму калегіуму, які потым стаў акадэміей.

На пачатковых этапах работы друкарні (1586-1589) на кнігах змяшчаўся надпіс «у друкарні Радзвілы», і толькі з 1592 года на кнігах з'яўляецца надпіс «у друкарні акадэміі».

Друкарня з самага пачатку разгарнула актыўную выдавецкую дзейнасць.

У асноўным яна задавальняла патрэбы акадэміі, гэтым і вызначаўся яе выдавецкі план. Галоўным накірункам працы быў выпуск тэолага-палемічнай і павучальнай літаратуры. Найбольш часта выходзілі кнігі Пятра Скаргі (8), Ст. Градзіцкага (9), М. Сміглецкага (8), Х. Варшавецкага (6), А. Юргевіча (6). Амаль усе яны палемічнага характару. Дарэчы, Пётр Скарга, адзін са стваральнікаў і кіраўнікоў калегіума і акадэміі ў Вільні, і паклаў пачатак кніжнай палеміцы. У 1576 годзе ў друкарні выйшла яго кніга «Пра таінствы» амаль на 500 старонках, дзе ў пасляслоўі паведамляецца пра тое, што Мікалай Крыштоф Радзівіл перадаў друкарню ў распараджэнне калегіума «каб яна, служыўшая да гэтага часу рассейванню ерасі, паслужыла зараз для распаўсюджвання праўды каталіцкай», і магнат ўсхваляецца за такі рэдкі дар.

Асобным раздзелам у выдавецкім плане акадэміі стала выданне вучэбнай літаратуры. У першыя гады свайго існавання друкарня выпусціла серыю выданняў па тэалогіі, філасофіі, логіцы, фізіцы. У большасці яны выходзілі без указання імён аўтараў, якімі часцей за ўсё з'яўляліся выкладчыкі акадэміі, рыхтаваўшыя выданні ў якасці дапаможнікаў для студэнтаў па пэўных курсах.

З уласна падручнікаў друкарня акадэміі выпусціла ў XVIст. толькі падручнік па граматыцы лацінскай мовы партугальскага філосафа Эм.Альварэса, які карыстаўся вялікай папулярнасцю. Яшчэ ў XVIII ст. у Вільні гэты падручнік перавыдаваўся 17 разоў. Даследчыкі называюць яшчэ падручнікі па палітэканоміі і рыторыцы.

Большасць выданняў друкарні вызначаецца сваёй добрай паліграфічнай якасцю і афармленнем. Нават у падручніках шмат упрыгожванняў, разнастайныя застаўкі і канцоўкі, добрая папера.

Друкарня акадэміі была адной з самых даўгавечных у Вільні. У XVII-XVIII стст. яна займалася галоўным чынам перавыданнем твораў Вуйкі і Скаргі, богаслужэбных кніг, падручнікаў. Значныя перамены адбыліся ў другой палове XVIIIст. Часцей сталі выходзіць вучэбныя дапаможнікі і навуковыя працы. З 1737 года рэгулярна выдаюцца календары, а з 60-х гадоў пачынаецца выпуск газет.

У сувязі з закрыццём езуцкага ордэна друкарня перадаецца ва ўладанне ўтворанай на аснове акадэміі ў 1781 годзе Галоўнай школы ВКЛ, а з арганізацыяй Віленскага універсітэта пераходзіць да яго валодання. Хутка пасля гэтага яе кіраўніком стаў І. Завадскі, які заняўся рэканструкцыяй і абнаўленнем друкарні. Як друкарня Завадскіх яна праіснавала да 1919 года.

У фондах НПГКМЗ захоўваецца некалькі выданняў Віленскай акадэмічнай друкарні. Яны ўвойдуць у агульны каталог «Беларускія лаціна-польскія выданні XVI-XVIII стст. у фондах НПГКМЗ».

Кніга «**Statut Wielkiego Xiestwa Litewskiego**», «Статут Вялікага Княства Літоўскага» 1588 года.

Вільна. Акадэмічная друкарня, 1693.

Папера ручнога адліву, кардон, скура. Друк тыпаграфскі, ксілаграфія.

**ПГАЗ КП10-6016**

Кніга была перададзена ў фонды НПГКМЗ гал. рэдактарам БелСЭ Петрашкевічам А.Л. у 1990 годзе. (АП № 59 ад 24.05.1990 г.)

«Статут ВКЛ» падрыхтаваны кваліфікаванымі правазнаўцамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А.Б. Валовіча і падканцлера Л.І. Сапегі. У Статут увайшлі нормы дзяржаўнага права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. У ім знайшлі адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, адм. аппарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморныя суды, выбарныя і незалежныя адміністрацыі).

Статут ВКЛ 1588 года – самы вялікі кодэкс. З'яўляецца выдатным помнікам беларускай мовы і юрыдычнай думкі феадальнай эпохі, дзе замацаваны лепшыя моўныя здабыткі канцылярска-юрыдычнага пісьма таго часу.

Статут 1588 года ўпершыню быў надрукаваны на беларускай мове ў віленскай друкарні Мамонічаў пад наглядам Льва Сапегі ў 1588 годзе. Выданне двойчы паўторана (каля 1592 і 1600 гг.) з выхадной датай 1588. У 1614 і 1619 гг. і каля 1623 г. (з датай 1619) Л. Мамоніч выдаў яго на польскай мове. У 1648 годзе на польскай мове быў надрукаваны ў Варшаве. Затым польскамоўныя выданні выйшлі ў акадэмічнай друкарні ў Вільні ў 1693 г., 1744 г., 1786 г. і ў друкарні Марціноўскага ў 1819 г. У 1811 г. на польскай і рускай мове быў надрукаваны ў Санкт-Пецярбургу, у 1854 г. на беларускай мове ў Маскве.

Статут мае 14 раздзелаў, 488 артыкулаў.

Выданне, якое знаходзіцца ў фондах НПГКМЗ поўнае, вокладка са скуры шэра-жоўтага колеру. Нумарацыя артыкулаў прыводзіцца рымскімі і арабскімі лічбамі.

*Склад.*

Прадмова – 2 + 7 непранумараваных с.

Уступнае слова Льва Сапегі – 4 с.

Прысвячэнне Альжбеце Агінскай-Пузыне* – 1 с.

Кароткая дэкламацыя – 1 с.

<u>Раздзел 1</u>. Аб персоне нашай гаспадарскай, с. 1-36. Змяшчае 35 артыкулаў.

<u>Раздзел 2</u>. Аб абароне зямельных правоў, с. 37-59.

---

* Альжбета Агінская-Пузына была фундатаркай Віленскай езуіцкай акадэміі.

Змяшчае 27 артыкулаў.

Раздзел 3. Аб вольнасцях шляхецкіх, с. 60-112.
Змяшчае 51 артыкул.

Раздзел 4. Аб суддзях і судах, с. 113-123.
Змяшчае 105 артыкулаў.

Раздзел 5. Аб праве пасагу і прыданым, с. 224-240.
Змяшчае 22 артыкулы.

Раздзел 6. Аб апеках, с. 241-252.
Змяшчае 15 артыкулаў.

Раздзел 7. Аб запісах і продажу, с. 253-273.
Змяшчае 31 артыкул.

Раздзел 8. Аб спадчыне, с. 274-279.
Змяшчае 9 артыкулаў.

Раздзел 9. Аб падкаморных у паветах, аб правах земляных, аб межах, с. 280-306.
Змяшчае 32 артыкулы.

Раздзел 10. Аб пушчах, аб азёрах, аб сенажацях, с. 307-315.
Змяшчае 18 артыкулаў.

Раздзел 11. Аб гвалтах, баях, галаўшчыне шляхецкай, с.317-329.
Змяшчае 68 артыкулаў.

Раздзел 12. Аб такіх людзях і чэлядзі, што ад паноў сваіх адыходзяць, с. 370-390.
Змяшчае 24 артыкулы.

Раздзел 13. Аб грабяжах і аб навуках, с. 391-396.
Змяшчае 14 артыкулаў.

Раздзел 14. Аб усялякім зладзействе, с. 397-421.
Змяшчае 37 артыкулаў.

Да чытача міласцівага – 1 с.

Кніга надрукавана на паперы розных гатункаў з выразна бачнымі вадзянымі знакамі. Часцей за астатнія сустракаюцца вадзяныя знакі «лілея» і «літары», крыху менш «дубы» і «месяц», толькі на адным лісце знак «рыбы». Выданне прыгожа і якасна аздоблена. Кніга ўпрыгожана разнастайнымі застаўкамі

і канцоўкамі расліннага характару, стылізаванымі застаўкамі і канцоўкамі ў выглядзе фігур анёлаў і людзей, вазонаў з кветкамі. Пры друкаванні выкарыстаны гатычны шрыфт , для аздаблення выкарыстоўваецца антыква. Частка артыкулаў надрукавана паралельна лацінскім і гатычным шрыфтамі. Вельмі многа прыгожых ініцыялаў.

Захаванасць добрая, невялікія пацёртасці скуры на вокладцы, пажаўценне паперы, невялікія плямы, надрывы вуглоў.

29,5х20,5х6,5 (43,0).

Кніга «**Praelectiones Mathematicae ex Wolfianis Elementari**s». «Лекцыі па элементарнай матэматыцы». Аўтар-складальнік Якуб Накцыяновіч.

Вільна. Акадэмічная друкарня. 1759.

Папера ручнога адліву, кардон, скура. Друк тыпаграфскі, цісненне.

**ПГАЗ КП7-3798**

Кніга паступіла ў фонды ў снежні 1987 года ад жыхара г.Даўгаўпілса Голева А.В. (АП № 2 ад 24.12.1987 г.).

Кніга з'яўлялася падручнікам па матэматыцы і прызначалася для слухачоў акадэміі. Матэрыял размешчаны па частках, раздзелах, параграфах. Даецца падрабязнае тлумачэнне кожнай тэарэмы, аксіёмы, праблемы, асноўных палажэнняў. Яны пранумараваны асобна па арыфметыцы і геаметрыіі. Да некаторых раздзелаў геаметрыі і трыганаметрыі прыкладаюцца табліцы, на якія тут жа на палях даецца спасылка.

Матэрыял размешчаны вельмі зручна, даступна тлумачыцца кожнае палажэнне.

*Склад.*

Прадмова аўтара падручніка – 1 непран. с.

Прысвячэнне-падзяка Альжбеце Агінскай-Пузыне за дапамогу ў выданні падручніка – 3 непранумараваныя с.

Уступная частка да курса матэматыкі – 7 непранум. с.

Метады матэматыкі.Агульная характарыстыка – 3 непранумар. с.

Метады матэматыкі. Кароткія каментарыі, с. 1-7.

Элементарная арыфметыка, с. 8-151.

Элементарная геаметрыя. Уступная частка – 4 непранум. с.

Элементарная геаметрыя. Раздзел асноўны.Часткі 1-7, с. 1-222.

Элементарная геаметрыя.Раздзел дадатковы. Часткі 1-3, с. 223-272.

Элементарная трыганаметрыя. Уступ, с. 273-274.

Элементарная трыганаметрыя. Часткі 1-3, с. 275-310.

Дадатак – 16 табліц на разгорнутых старонках, на якіх геаметрычныя фігуры, схемы, табліцы.

На тытульным лісце, на разваротах форзацаў маюцца запісы чорнай тушшу. Запіс на развworotным тытульным лісце вызначае прыналежнасць кнігі да пэўнай асобы (некалькі невыразных аўтографаў). Зроблены рукапісны экслібрыс Антонія Апачы.

Перад асноўным тэкстам ліст з прысвячэннем-падзякай Лізавеце (Альжбеце) Агінскай-Пузыне за дапамогу ў ілюстраванні і выданні падручніка.

Кніга цікава і прыгожа аздоблена. У пачатку раздзелаў прыгожыя ініцыялы, застаўкі і канцоўкі расліннага арнаменту. Асабліва выдзяляюцца канцоўкі ў выглядзе букетаў з кветак у вазах.

Папера ручнога адліву з фрагментамі вадзяных знакаў. На старонках табліц вадзяныя знакі больш выразныя, часцей за ўсё сустракаецца з выявай літар.

Захаванасць кнігі здавальняючая, пераплёт пашкоджаны жучком, пажаўценне паперы.

15,9x9,5x3,3 (30,0).

Кніга «**Regula S. Augustini Episkopi et Constitutiones Fratrum odris Praedicatorum**» «Правілы Святога Аўгусціна епіскапа, устаноўленыя брацтвам і ім аб'яўленыя».

Вільна. Акадэмічная друкарня. 1798.

Папера ручнога адліву , кардон, скура. Друк тыпаграфскі.

**ПГКЗ КП7-3965**

Паступіла ў фонды ў красавіку 1987 года ад жыхара г.Даўгаўпілса Голева А.В. (АП № 42 ад 27.04.1987 г.)

*Склад.*

Тытульны ліст

На адвароце тыт.ліста – зварот да чытачоў.

Прадмова – 2 непранумараваныя старонкі.

Пачатковыя правілы святога Аўгусціна епіскапа, с. 1-29.

Агульныя правілы, с. 30-45.

<u>Раздзел 1</u>. Правілы, якіх павінны прытрымлівацца ў царкве, с. 46-149.

<u>Раздзел 2</u>. Правілы, якіх павінны прытрымлівацца дома, с. 150-262.

Пасланне святога Дамініка.

Змест – 2 непранумараваныя старонкі.

Кніга аздоблена прыгожымі застаўкамі і канцоўкамі, на многіх старонках уверсе і ўнізе віньеткі расліннага арнаменту.

На адвароце тытульнага ліста адбітак авальнай пячаткі манаскага ордэна аўгусцінцаў.

Захаванасць добрая, пацёртасці скуры, пажаўценне паперы, невялікія плямы на некаторых старонках.

10,5х6,5х2,4 (13,5)

Кніга «**Przepisy dla Kaznodziejow**», «Правілы для прапаведнікаў».

Напісана па французку Майсіёнам Жанам Бацістам. Пераклад на польскую мову Аўгусціна Тамашэўскага.

Вільна. Акадэмічная друкарня.1799.

**ПГАЗ КП7-3968**

Папера ручнога адліву, кардон, скура. Друк тыпаграфскі, цісненне.

Кніга паступіла ў фонды ад жыхара г. Даўгаўпілса Голева А.В. (АП № 46 ад 17.05.1988 г. Пр.зак. № 34 ад 17.05.1988 г.)

270 пранумараваных стар.+ 12 непранумараваных старонак у пачатку кнігі + 2 непранумараваных старонкі ў канцы кнігі.

Кніга з'яўлялася дапаможнікам для духоўных асоб і людзей, якія жадалі стаць прапаведнікамі. Давала рэкамендацыі як агульнага характару, так і па вельмі вузкіх накірунках.

*Склад.*

Уступнае слова Х.А. Тамашэўскага – 3 с.

Прадмова – 3 с.

Тлумачэнні і ўдакладненні аўтара – 3 с.

Частка першая. Аб прапаведніках.

Раздзел 1. Аб прызванні, с. 13-19.

Раздзел 2. Аб годнасці прапаведнікаў, с. 19-30.

Раздзел 3. Аб дасціпнасці, с. 31-39.

Раздзел 4. Аб навуках, якія павінен ведаць прапаведнік, с. 39-55.

Раздзел 5. Аб звычаях, с. 56-68.

Раздзел 6. Аб памяці, с. 69-75.

Раздзел 7. Аб занятках паўсядзённых, с. 77-79.

Раздзел 8. Аб знешнім выглядзе, с. 80-89.

Раздзел 9. Аб жэстах, с. 89-91.

Раздзел 10. Аб голасе, с. 91-98.

Раздзел 11. Аб прыстойнасці адзення, с. 99-105.

Частка другая. Аб пропаведзях.

Раздзел 1. Аб змесце і розных відах пропаведзяў, с.107-151.

Раздзел 2. Аб змесце пісьма святога, с. 151-152.

Раздзел 3. Аб тэмпе, с. 153-157.

Раздзел 4. Аб вітанні і пахвалах, с. 158-160.

Раздзел 5. Аб дзяленні казанняў на часткі, с. 160-165.

Раздзел 6. Аб парадку казанняў, с. 165-175.

Раздзел 7. Аб прынцыпах казанняў, с. 175-181.

Раздзел 8. Аб вывадах, с. 181-190.

Раздзел 9. Аб цытатах, с. 190-198.

Раздзел 10. Аб думках, с. 198-206.

Раздзел 11. Аб лаканічнасці казанняў, с. 206-212.

Раздзел 12. Аб віртуознасці, с. 213-220.

Раздзел 13. Аб выразнасці, с. 220-229.

Раздзел 14. Аб падабенствах і прыкладах, с. 229-233.

Раздзел 15. Аб красамоўстве, с. 233-245.

Раздзел 16. Аб стылі, с. 245.

Раздзел 17. Аб маральных высновах, с. 257-267.

Раздзел 18. Аб вымаўленні, с. 267-271.

Раздзел 19. Аб прыгажосці мовы, с. 271-275.

Раздзел 20. Аб заключных частках, с. 275-277.

Раздзел 21. Аб карысці казанняў для прапаведнікаў, с. 277-282.

Асноўны змест матэрыялаў у алфавітным парадку, с. 283-285.

Кніга ўпрыгожана застаўкамі і канцоўкамі расліннага характару. Фрагменты вадзяных знакаў невыразныя.

Захаванасць здавальняючая, маюцца пацёртасці вокладкі, зацёрта скура на навугольніках, плямы і пажаўценне паперы.

16,8х10,0х2,6 (21,2).

## Дадатак

**Накцыяновіч Якуб** (1725-1790). Нарадзіўся ў Рагачове. Беларускі матэматык і філосаф.Доктар філасофіі, тэалогіі і царкоўнага права. Скончыў Віленскую акадэмію, дзе потым загадваў кафедрамі матэматыкі і філасофіі. Быў дырэктарам Віленскай астранамічнай абсерваторыі. З 1771 года працаваў у навучальных установах Гродна. Аўтар двух падручнікаў па матэматыцы, выдадзеных на лацінскай мове.

**Аўгусцін Аўрэлій** (Аўгусцін Блажэнны) (354-430 гг.) – хрысціянскі багаслоў, філосаф, буйнейшы прадстаўнік заходняй (лац.) патрыстыкі (кананічна зацверджанай літаратуры), адзін з самых пладавітых пісьменнікаў сусветнай літаратуры (93 працы ў 232 кнігах). Нарадзіўся ў Алжыры, пазней жыў у Рыме, Мілане. Потым вярнуўся на радзіму. Апошнія 35 гадоў жыцця быў епіскапам г. Гіпон. Яго вучэнне – філосафа-тэалагічнае абгрунтаванне хрысціянства ў духу неаплатанізму.Не адмаўляючы свецкай ўлады, аддаваў перавагу ўладзе духоўнай. На Беларусі яго творы вядомы з XI ст., у XVI-XVII стст. да іх яшчэ больш узрасла цікавасць, калі тут былі перавыдадзены яго творы.

**Аўгусцінцы** – члены каталіцкага жабрацкага ордэна. Паводле легендарнай версіі, ордэн быў утвораны ў 391 г. біскупам г. Гіпон Аўрэліем Аўгусцінам. На самай справе ён узнік пасля аб’яднання 4 кангрэцый манахаў-пустэльнікаў і зацверджаны булай папы Аляксандра IV у 1256 годзе пад назвай «Ордэн пустэльнікаў святога Аўгусціна».У аснову яго дзейнасці пакладзены «Правілы святога Аўгусціна» – зборнік тэкстаў, напісаных нібыта Аўрэліем Аўгусцінам. На тэрыторыі ВКЛ аўгусцінцы былі адным з самых нешматлікіх ордэнаў. На Беларусі яны мелі кляштары ў Брэсце, Гродне, в. Міхаліцкі Астравецкага р-на.

**Масіён Жан Баціст** (1663-1743 ) – знакаміты французскі прапаведнік, сын беднага натарыуса ў Правансе, на 18-м годзе жыцця ўступіў у ордэн даміліканцаў. Працаваў дырэктарам семінарыі ў Парыжы. У 1717 годзе рэгент зрабіў Масіёна епіскапам Клярмонскім, у 1719 годзе ён быў выбраны ў члены французскай акадэміі. Славіўся свамі прыгожымі пропаведзямі і казаннямі, быў вельмі папулярны сярод прыхаджан.

## Змест

**Памяти Николая Николаевича Ильницкого** ........................ 5

**Андреева Н.А.** Что такое Детский музей: поиски дефиниций и определение стандартов .................. 7

**Касатая Т.Н.** Влияние музейно-педагогических занятий цикла изобразительного искусства на развитие воображения и речевой деятельности дошкольников ............................................ 14

**Козел О.В.** Проблема комплектования и подготовки кадров медицинского персонала на Полотчине в 20-30-е годы ............................................ 20

**Лысенко Л.М.** Хроника Художественной галереи .............. 31

**Салаўёў А.А.** Кафляныя печы XVIII – пачатку XIX стст. Полацкага езуіцкага калегіума (па назіраннях на першым паверсе карпусоў «А» і «Г») ......................... 33

**Смирнова Т.Р.** Особенности адаптации учеников вспомогательной школы в музейном пространстве ........ 63

**Сяргеенка Н.А.** Дэйніс Пятро Язэпавіч – выдатны полацкі краязнаўца ............................................ 68

**Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ**

**Воднева І.П.** Газеты 1941-1945 гг., надрукаваныя на тэрыторыі Беларусі, у фондах НПГКМЗ ......................... 82

**Галюк Е.М.** Монеты России 1700-1917 гг. в нумизматической коллекции НПИКМЗ (обзор коллекции, состав, структура каталога) ............. 131

**Ушакова Е.А.** Коллекция поддужных колокольчиков в фондах НПИКМЗ ................................. 136

**Шульчанка В.А.** Беларускія часопісы 1945-2000 гг.
у фондах НПГКМЗ ........................................................ **143**

**Шупенька І.А.** Выданні друкарні Віленскай езуіцкай
акадэміі ў фондах НПГКМЗ ........................................... **179**

**Змест** ........................................................................................ **189**

# Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі

(па выніках навукова-даследчай работы ў 2005 г.)

Падпісана да друку 01.12.2006 г.
Фармат 60х84 1/16. Папера Снегурачка. Гарнітура Times.
Друк лазерны. Тыраж 50.

Надрукавана на выдавецкім комплексе НПГКМЗ.